Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 177 (6756) | 2 жніўня 1940 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная библиотека имени В. И. Ленина

АБ ЧАРГОВЫМ ПЛЕНУМЕ ЦК ВКП(б)

Пэтымі днямі адбыўся чарговы пленум ЦК ВКП(б).

Пленум заслухаў паведамленне аб знешняй палітыцы ўрада і адобрыў яго.

Пленум абмеркаваў пытанні:

а) аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў і прыняў адпаведнае рашэнне,

б) аб кантролі над правядзеннем у жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года „Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў“ і прыняў адпаведную пастанову.

Пленум адобрыў прапанову Соўнаркома СССР аб утварэнні Наркамата Дзяржаўнага Кантролю.

VII Сесія Вярхоўнага Совета СССР першага склікання

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА СОВЕЦКАГА САЮЗА

Даклад Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. МОЛАТАВА на пасяджэнні Вярхоўнага Совета СССР 1 жніўня 1940 года

Таварышы дэпутаты!

За мінуўшыя пасля Шостай Сесіі Вярхоўнага Совета чатыры месяцы ў Еўропе адбыліся падзеі вялікай важнасці. У рэзультаце разгарнуўшыхся ваенных дзеянняў з боку Германіі, спачатку ў Нарвегіі і Даніі, а затым у Бельгіі і Галандыі і, нарэшце, на тэрыторыі Францыі, вайна ў Еўропе набыла вялікі размах. 10 чэрвеня да Германіі далучылася Італія, аб'явіўшая вайну Англіі і Францыі. Такім чынам, чацвертая буйнейшая еўрапейская дзяржава ўступіла ў вайну.

З вясны гэтага года вайна стала разгортвацца быстрымі тэмпамі. Не спыняючыся на падзеях, якія мелі месца ў Нарвегіі, Даніі, Бельгіі і Галандыі, трэба асоба адзначыць факт быстрага паражэння і капітуляцыі Францыі. За якія-небудзь месяц-паўтара германская армія не толькі зламала супраціўленне Францыі, але і прымусіла яе падпісаць умовы перамір'я, па якіх большая частка тэрыторыі Францыі, разам з Парыжам, прадаўжае аставацца тэрыторыяй, акупіраванай германскімі войскамі. Тым не менш, атрымаўшы перамір'е, Францыя яшчэ не мае міру. Аб умовах міру наогул яшчэ нічога не вядома. З двух саюзнікаў, процістаячых Германіі і Італіі, асталася толькі Англія, якая пачала прадаўжаць вайну, апіраючыся на дапамогу ЗША.

Тут няма неабходнасці спыняцца на ўсіх прычынах паражэння Францыі, выявіўшай сваю выключную слабасць у вайне. Ясна, што справа тут не толькі ў дрэннай ваеннай падрыхтоўцы, — хоць гэта прычына стала агульнавядомай. Не малую ролю адыграла тут таксама тая акалічнасць, што французскія кіруючыя кругі — не ў прыклад Германіі — надта лёгкамысленна аднеслісся да пытання аб ролі і ўдзельнай вазе Совецкага Саюза ў справах Еўропы.

Падзеі апошніх месяцаў наглядна паказалі нешта большае. Яны паказалі, што правячыя кругі Францыі не быці звязаны з народам і не толькі не апіраліся на яго, але баяліся свайго народа, маючага заслужаную славу свабодалюбнага народа з слаўнымі рэволюцыйнымі традыцыямі. У гэтым адна з сур'ёзных прычын ускрыўшайся слабасці Францыі.

Перад народам Францыі стаяць цяпер цяжкія задачы залечвання ран, нанесеных вайной, а затым і задачы адраджэння, якія, аднак, нематчыма ажыццявіць старымі метадамі.

Германія дабілася ў вайне супроць саюзнікаў вялікіх поспехаў, але яна яшчэ не дабілася сваёй асноўнай задачы — спынення вайны на пажаданых для яе ўмовах. 19 ліпеня рэйхсканцлер Германіі зноў звярнуўся да Англіі з заклікам дагаварыцца аб міры, але англійскі ўрад, як вядома, адверг гэту прапанову. Англійскі ўрад вытлумачыў гэту прапанову, як патрабаванне капітуляцыі Англіі і адказаў заяваю, што ён будзе прадаўжаць вайну да перамогі. Ён пайшоў нават на разрыў дыпламатычных адносін з сваёй учарашняй саюзніцай — Францыяй. Гэта значыць, што ўрад Англіі не хоча паступіцца сваімі калоніямі, якія ёсць ва ўсіх частках зямнога шара, і заяўляе аб гатоўнасці весці і далей вайну за сусветнае панаванне, не гледзячы на тое, што пасля паражэння Францыі і ўступлення ў вайну Італіі на старане Германіі, гэта барацьба для Англіі стала значна трудней.

Набліжаецца канец першаму году еўрапейскай вайны, але канца гэтай вайны яшчэ не відаць. Больш магчымым трэба лічыць, што ў даны момант мы стаім напярэдадні новага этапу ўзмацнення вайны паміж Германіяй, Італіяй, з аднаго боку, і Англіяй, якой дапамагаюць Злучаныя Штаты Амерыкі,—з другога боку.

Усе ўказаныя падзеі не змянілі знешняй палітыкі Совецкага Саюза. Верны палітыцы міру і нейтралітэта Совецкі Саюз не ўдзельнічае ў вайне. Нашы адносіны з Германіяй, паварот у якіх адбыўся амаль год таму назад, прадаўжаюць поўнасцю захоўвацца, як гэта абумоўлена совецка-германскім пагадненнем. Гэта пагадненне, якога строга прытрымліваецца наш ўрад, устараніла магчымасць трэнняў у совецка-германскіх адносінах пры правядзенні совецкіх мерапрыемстваў уздоўж нашай заходняй граніцы і, разам з тым, забяспечыла Германіі спакойную ўпэўненасць на ўсходзе.

Ход падзей у Еўропе не толькі не паслабіў сілы совецка-германскага пагаднення аб ненападзе, але, наадварот, падкрасліў важнасць яго існавання і далейшага развіцця. За апошні час у замежнай і, асабліва, у англійскай і англафільствуючай прэсе нярэдка спекуліравалі на магчымасці рознагалоссяў паміж Совецкім Саюзам і Германіяй, са спробай запалохаць нас перспектывай узмацнення магутнасці Германіі. Як з нашай, так і з германскай стараны гэтыя спробы не раз выкрываліся і адкідаліся, як нягодныя. Мы можам толькі пацвердзіць, што, па нашай думцы, у аснове склаўшыхся добрасуседскіх і прыязных совецка-германскіх адносін ляжаць не выпадковыя меркаванні кан'юктурнага характару, а карэнныя дзяржаўныя інтарэсы як СССР, так і Германіі.

Трэба таксама адзначыць, што нашы адносіны з Італіяй палепшыліся за апошні перыяд. Абмен думак з Італіяй паказаў, што ў галіне знешняй палітыкі ў нашых краін ёсць поўная магчымасць забяспечыць узаемнае разуменне. Упаўне абгрунтаваны таксама разлікі на ўзмацненне гандлёвых адносін.

Што-ж датычыць совецка-англійскіх адносін, то ў іх не адбылося за апошні час якіх-небудзь істотных змен.

Трэба прызнаць, што пасля ўсіх тых варожых актаў Англіі супроць СССР, аб якіх не раз ужо прыходзілася гаварыць на Вярхоўным Совеце, цяжка было чакаць добрага развіцця совецка-англійскіх адносін, хоць назначэнне п. Крыпса паслом у СССР, магчыма, адлюстроўвае жаданне Англіі палепшыць адносіны з Совецкім Саюзам.

Цяпер дазвольце перайсці да тых пытанняў нашай знешняй палітыкі, паспяховае вырашэнне якіх у апошні час значна расшырыла нашу тэрыторыю і ўмножыла сілы Совецкага Саюза. **(Бурныя апладысменты).**

Тут няма неабходнасці падрабязна спыняцца на тым, як адбылося далучэнне да Совецкага Саюза Бесарабіі і Паўночнай Букавіны. Адпаведныя дакументы поўнасцю былі апублікаваны 28 чэрвеня. У прадстаўленні, якое мною было зроблена румынскаму пасланніку ў Маскве п. Давідэску, прапаноўвалася:

1. Вярнуць Бесарабію Совецкаму Саюзу.

2. Перадаць Совецкаму Саюзу паўночную частку Букавіны.

Як вядома, урад Румыніі прыняў нашу прапанову, і канфлікт паміж Совецкім Саюзам і Румыніяй, які зацягнуўся на 22 годы, быў вырашан мірным шляхам. **(Апладысменты).** Пражываўшыя на тэрыторыі Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, галоўным чынам, украінцы і малдаване атрымалі магчымасць увайсці ў дружную сям'ю совецкіх народаў і зажыць новым жыццём, — жыццём народа, вызваленага ад улады румынскіх баяр-памешчыкаў і капіталістаў. **(Працяжныя апладысменты).** Мы ведаем цяпер, з якой вялікай радасцю насельніцтва Бесарабіі і Паўночнай Букавіны ўступіла ў рады совецкіх грамадзян.

Такім чынам, тэрыторыя Совецкага Саюза павялічылася далучэннем Бесарабіі, плошчай у 44,5 тысячы квадратных кілометраў, з насельніцтвам 3.200 тысяч чалавек, і далучэннем Паўночнай Букавіны, плошчай у 6 тысяч квадратных кілометраў, з насельніцтвам звыш 500 тысяч чалавек.

Граніцы Совецкага Саюза перасунуліся, у сувязі з гэтым, на захад і дайшлі да ракі Дуная, якая з'яўляецца, пасля Волгі, самай магутнай ракой у Еўропе і адным з важнейшых пуцей тавараабмену для раду еўрапейскіх краін.

Вы ведаеце, таварышы, што ўвесь совецкі народ з вялікай радасцю і задавальненнем сустрэў паспяховае вырашэнне доўгачаканага пытання аб Бесарабіі. З другога боку, нашы адносіны з Румыніяй цяпер павінны ўвайсці ў зусім нармальнае русла.

Пераходжу да пытання аб нашых адносінах з Літвой, Латвіяй і Эстоніяй. Пытанне аб узаемаадносінах Совецкага Саюза з прыбалтыйскімі краінамі ўстала ў апошні час па-новаму, паколькі заключаныя з Літвой, Латвіяй і Эстоніяй пакты аб узаемадапамозе не далі патрэбных рэзультатаў. Заключэнне гэтых пактаў не павяло, як гэтага трэба было чакаць, да збліжэння Літвы, Латвіі і Эстоніі з Совецкім Саюзам, таму што гэтаму запрацівіліся правячыя буржуазныя групы гэтых краін. Гэтыя правячыя групы не толькі не пайшлі па шляху збліжэння з Совецкім Саюзам, чаго як быццам можна было чакаць пасля заключэння пактаў узаемадапамогі, але пайшлі па шляху ўзмацнення варожых Совецкаму Саюзу дзеянняў, якія праводзіліся імі тайком і за спіной СССР. Для гэтага была выкарыстана так званая Балтыйская Антанта, у якой раней ваенным саюзам, накіраваным супроць СССР, былі звязаны толькі Латвія і Эстонія, але якая з канца мінулага года ператварылася ў ваенны саюз, уключаючы апрача Латвіі і Эстоніі таксама і Літву.

З гэтага следуе, што правячыя буржуазныя групы Літвы, Латвіі і Эстоніі аказаліся няздольнымі да чэснага правядзення ў жыццё заключаных Совецкім Саюзам пактаў узаемадапамогі, што яны, наадварот, яшчэ ўзмацнілі варожую Совецкаму Саюзу дзейнасць. Колькасць фактаў, гаворачых аб тым, што ўрады гэтых краін груба нарушаюць заключаныя з СССР пакты ўзаемадапамогі, усё павялічвалася. Далей цярпець такое становішча, асабліва ва ўмовах сучаснай міжнароднай абстаноўкі, станавілася зусім немагчымым. Вось чаму паследвалі вядомыя вам патрабаванні Совецкага ўрада аб змене саставу ўрадаў Літвы, Латвіі, Эстоніі і аб уводзе на тэрыторыю гэтых дзяржаў дадатковых часцей Чырвонай Арміі.

Рэзультаты гэтых крокаў нашага ўрада вам вядомы.

Важнейшай мерай створаных у Эстоніі, Латвіі і Літве прыязных Совецкаму Саюзу ўрадаў было правядзенне свабодных выбараў у парламенты. У ліпені месяцы былі праведзены дэмакратычныя выбары



ў літоўскі сейм, у латвійскі сейм і ў дзяржаўную думу Эстоніі. Выбары паказалі, што правячыя буржуазныя клікі Літвы, Латвіі і Эстоніі не адлюстроўвалі волю сваіх народаў, што яны былі прадстаўнікамі толькі вузкай групы эксплаататараў. Выбраныя на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага галасавання, з тайнай падачай галасоў сеймы Літвы і Латвіі, дзяржаўная дума Эстоніі ўжо выказалі сваю аднадушную думку па карэнных палітычных пытаннях. Мы з задавальненнем можам канстатаваць, што народы Эстоніі, Латвіі і Літвы дружна прагаласавалі за сваіх прадстаўнікоў, якія аднадушна выказаліся за ўвядзенне совецкага ладу і за ўступленне Літвы, Латвіі і Эстоніі ў састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. **(Бурныя апладысменты).**

Тым самым узаемаадносіны паміж Літвой, Латвіяй, Эстоніяй і Совецкім Саюзам павінны ўстаць на новую аснову.

Вярхоўны Совет будзе разглядаць пытанне аб уваходжанні ў Совецкі Саюз Літвы, Латвіі і Эстоніі ў якасці Саюзных Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Няма ніякага сумнення ў тым, што ўваходжанне гэтых рэспублік у Совецкі Саюз забяспечыць ім быстры гаспадарчы ўздым і ўсебаковы росквіт нацыянальнай культуры, што ўваходжаннем у Совецкі Саюз іх сілы будуць у многа разоў умножаны, іх безапаснасць будзе ўмацавана і, разам з тым, яшчэ больш узрасце магутнасць вялікага Совецкага Саюза. **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты).**

Уваходжанне прыбалтыйскіх краін у СССР азначае, што Совецкі Саюз павялічваецца на 2.880 тысяч насельніцтва Літвы, на 1.950 тысяч насельніцтва Латвіі і на 1.120 тысяч насельніцтва Эстоніі.

Такім чынам, разам з насельніцтвам Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, насельніцтва Совецкага Саюза павялічыцца, прыкладна, на 10 мільёнаў чалавек. **(Апладысменты).** Калі да гэтага дадаць звыш 13 мільёнаў насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, то, выходзіць, што Совецкі Саюз павялічыўся за апошні год больш, чым на 23 мільёны насельніцтва. **(Апладысменты).**

Трэба адзначыць, што $^{19}/_{20}$ усяго гэтага насельніцтва ўваходзіла раней у саставу СССР, але было сілай адарвана ад СССР у момант яго ваеннай слабасці імперыялістычнымі дзяржавамі Захада. Цяпер гэта насельніцтва з'еднана з Совецкім Саюзам.

Як паказваюць падлікі насельніцтва, Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік зможа цяпер гаварыць магутным голасам ад імені 193 мільёнаў насельніцтва, не лічачы прыросту насельніцтва СССР за 1939 і 1940 годы. **(Працяжныя апладысменты).**

Першаступеннае значэнне для нашай краіны мае той факт, што ад гэтага часу граніцы Совецкага Саюза будуць перанесены на ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Разам з гэтым, у нашай краіны паяўляюцца свае незамярзаючыя порты ў Балтыйскім моры, у якіх у нас такая вялікая патрэба.

Поспехі знешняй палітыкі Совецкага Саюза тым больш значны, што ўсяго гэтага мы дабіліся мірным шляхам, што мірнае вырашэнне пытанняў як у прыбалтыйскіх краінах, так і ў Бесарабіі прайшло пры актыўным удзеле і падтрыманні шырокіх народных мас гэтых краін. **(Апладысменты).**

Трэба, разам з тым, сказаць, што на ўрад Совецкага Саюза ўскладаецца вялікая адказнасць за правільнае і арганізаванае правядзенне практычных мер у справе палітычнай і эканамічнай перабудовы ў новых совецкіх рэспубліках.

На мінулай Сесіі Вярхоўнага Совета мне прыходзілася дакладваць аб мірным дагаворы з Фінляндыяй. Прайшло 4 з лішнім месяцы пасля заключэння гэтага дагавора, які праводзіцца ў агульным здавальняюча. За гэты час заключан ужо і гандлёвы дагавор з Фінляндыяй, прычым, мы лічым, што гаспадарчыя адносіны паміж нашымі краінамі могуць мець спрыяючую перспектыву развіцця. Фінляндскі ўрад прыняў таксама нашу прапанову аб дэмілітарызацыі Аландскіх астравоў і аб устанаўленні на гэтых астравах Совецкага консульства. Што датычыць далейшага развіцця совецка-фінляндскіх адносін у добрым для абодвух краін кірунку, то гэта залежыць, галоўным чынам, ад самой Фінляндыі. Зразумела, што калі некаторыя элементы фінляндскіх правячых кругоў не спыняць сваіх рэпрэсіўных дзеянняў супроць грамадскіх слаёў Фінляндыі, якія імкнуцца ўмацаваць добрасуседскія адносіны з СССР, то адносіны паміж СССР і Фінляндыяй могуць пацярпець упчэрб. **(Смех. Апладысменты).**

Нашы адносіны са скандынаўскімі краінамі — з Нарвегіяй і Швецыяй — не могуць не знаходзіцца ў залежнасці ад склаўшайся там абстаноўкі. У адносінах Нарвегіі, з прычыны яе асаблівага палажэння, зараз яшчэ нельга сказаць чаго-небудзь пэўнага. У адносінах Швецыі трэба прызнаць асабліва актуальным тое, што абедзве нашы краіны запікаўлены ў значным развіцці гандлёва-гаспадарчых адносін. Гаспадарчыя перагаворы, якія вядуцца зараз са Швецыяй, павінны спадзявацца, прывесці да пагаднення, маючага немалыя выгады для абодвух старон.

Што датычыць балканскіх краін, то трэба, перш за ўсё, адзначыць факт устанаўлення дыпламатычных адносін з Югаславіяй. Калі можна сказаць, што не па нашай віне да гэтага часу адсутнічалі дыпламатычныя адносіны паміж Совецкім Саюзам і Югаславіяй, то ўстанаўленне гэтых адносін цяпер адбылося па прапанове ўрада Югаславіі, якая была ахвотна прынята Совецкім Саюзам. Можна спадзявацца, што паступова будуць развівацца і нашы эканамічныя адносіны з Югаславіяй.

Нашы адносіны з Балгарыяй можна лічыць нармальнымі. Можна дадаць, што паміж Совецкім Саюзам і Балгарыяй няма такіх супярэчнасцей, якія перашкаджалі-б далейшаму паляпшэнню адносін.

У нашых адносінах з Турцыяй не адбылося якіх-небудзь істотных змен. Варта толькі сказаць, што апублікаваныя нядаўна ў германскай «Белай кнізе» дакументы кінулі непрыемнае святло на некаторыя стораны дзейнасці ў Турцыі. Паследаваўшыя затым раз'яснені французскага пасла ў Турцыі Масільі не змаглі нічога змяніць у характары гэтых дакументаў. У сувязі з гэтым я павінен сказаць, што яшчэ ў пачатку красавіка месяца совецкі ўрад заявіў Турцыі аб недапушчальнасці наступнага факта. Справа заключалася ў тым, што ў пачатку красавіка з тэрыторыі Турцыі прылятаў нейкі замежны самалёт у раён нашага горада Батумі, дзе знаходзіцца вялікая колькасць нафтаперагонных заводаў. Турэцкая старана спачатку прабавала паказаць справу так, што наогул ніякага самалёта з тэрыторыі Турцыі не пералятала, а затым усё-ж абяцала на будучы час прыняць меры супроць такога роду пералёту. **(У зале ажыўленне, смех).** Пасля апублікаваных у Германіі дакументаў відаць, што гэта быў за самалёт. З гэтага следуе, што наша прадстаўленне турэцкаму ўраду сапраўды было поўнасцю абгрунтаваным.

Што датычыць Ірана, то ніякіх новых важных момантаў нельга адзначыць. Аднак, і пры ўпамінанні аб Іране нельга прайсці міма аднаго недапушчальнага факта. У канцы сакавіка месяца ў раёне Баку, тэтак-жа як некалькі пазней, у раёне Батумі, паявіліся два замежныя самалёты, прыляцеўшыя з боку Ірана. Іранскі ўрад знайшоў патрэбным адмаўляць гэты факт. Але і ў даным выпадку памянёныя дакументы германскай «Белай кнігі» дастаткова раз'ясняюць справу.

Трэба заўважыць, што паўтарэнне пасылкі такіх разведчых замежных самалётаў ні да чаго іншага, як да ўскладнення нашых адносін з суседзямі не магло-б прывесці. Няпрошаныя-ж візіты ўказаных самалётаў да Баку і Батумі мы зразумелі ў тым сэнсе, што ў далейшым трэба ўзмацніць пільнасць і на гэтых паўднёвых совецкіх граніцах. **(Апладысменты).**

Адносна Японіі можна сказаць, што ў апошні час нашы адносіны пачалі некалькі нармалізіравацца. У прыватнасці, 9-га чэрвеня было дасягнута пагадненне аб удакладненні граніцы ў раёне мінулагодняга канфлікта на рацэ Халхын-Гол. Гэты факт мае тым большае значэнне, што меўшаяся доўгая затрымка ў вырашэнні гэтага пытання адмоўна адбівалася да апошняга часу на ўрэгуліраванні ўзаемаадносін паміж СССР і Японіяй, а таксама паміж Мангольскай Народнай Рэспублікай і Манчжоу-Го. У бліжэйшыя дні прыступае да работы змешаная камісія Мангольскай Народнай Рэспублікі і Манчжоу-Го для правядзення граніцы на месцы. Можна прызнаць, што наогул ёсць вядомыя прызнакі жадання японскай стараны да палепшання адносін з Совецкім Саюзам. Пры ўзаемным прызнанні інтарэсаў старон, паколькі абедзве стараны зразумеюць неабходнасць адхілення некаторых страшыўшых значэнне перашкод на гэтым шляху, такое палепшанне совецка-японскіх адносін ажыццявіма. Трэба, аднак, прызнаць, што ў праграме новага японскага ўрада наконт устанаўлення «новай палітычнай структуры» яшчэ многа няяснага. Відаць, што экспансія на поўдзень, аб якой шумяць японскія газеты, усё больш прыцягвае ўвагу кіруючых кругоў Японіі, асабліва з прычыны таго, што адбыўшыяся змяненні ў Еўропе не могуць не знайсці свайго адлюстравання ў раёнах, цікавячых гэтыя кругі Японіі. Але яшчэ ў многім няясны сапраўдныя палітычныя імкненні гэтых кругоў, што датычыць і совецка-японскіх адносін.

На нашых адносінах з Злучанымі Штатамі Амерыкі я спыняцца не буду, хоць-бы ўжо таму, што аб іх нельга сказаць нічога добрага. **(Смех).** Нам стала вядома, што сяму-таму ў Злучаных Штатах не падабаюцца поспехі совецкай знешняй палітыкі ў Прыбалтах. Але, прызнацца, нас мала цікавіць гэтая акалічнасць **(смех; апладысменты)**, паколькі з сваімі задачамі мы спраўляемся і без дапамогі гэтых нездаволеных паноў. **(Смех, апладысменты).**

Аднак, тая акалічнасць, што ў Злучаных Штатах улады незаконна затрымалі золата, нядаўна купленае нашым дзяржаўным банкам у банкаў Літвы, Латвіі і Эстоніі, выклікае з нашага боку самы энергічны пратэст. У даным выпадку мы можам толькі напомніць як ураду Злучаных Штатаў, так і ўраду Англіі, які стаў на той-жа шлях, аб іх адказнасці за гэтыя незаконныя дзеянні.

Што-ж датычыць нашых адносін з вялікім нацыянальным Кітаем, вядучым барацьбу за сваё існаванне, то яны захавалі свой добрасуседскі і прыязны характар, які выцякае з совецка-кітайскага пакта ненападу.

На гэтым дазвольце закончыць заўвагі, якія датычаць нашых адносін з асобнымі краінамі.

Мне астаецца сказаць некалькі слоў аб агульнай перспектыве развіцця міжнародных падзей.

Змены, якія адбыліся ў Еўропе ў рэзультаце вялікіх поспехаў германскай зброі, ні ў якім разе нельга прызнаць такімі, якія ўжо цяпер абяцалі-б блізкую ліквідацыю вайны. Падзеі прывялі к таму, што адна старана, асабліва Германія, значна ўзмацнілася ў рэзультаце сваіх ваенных поспехаў, другая-ж старана ўжо не прадстаўляе адзінага цэлага, прычым, калі для Англіі стварыліся новыя вялікія труднасці ў прадаўжэнні вайны, то вышаўшая з вайны Францыя перажывае цяжкі крызіс пасля паражэння. Узмацненне адной ваюючай стараны і аслабленне другой ваюючай стараны знаходзяць сур'ёзныя адбіткі не толькі ў Еўропе, але і ў іншых частках свету. У ліку пацярпеўшых паражэнне ёсць, апрача Францыі, Бельгія і Галандыя з вялікімі каланіяльнымі ўладаннямі, якія яны не могуць цяпер абараніць з ранейшай сілай. У рэзультаце гэтага пытанне аб перадзеле калоній набывае ўсё большую вастрыню. Імперыялістычныя апетыты растуць не толькі ў далёкай Японіі, але і ў Злучаных Штатах Амерыкі, у якой нямала ахвотнікаў прыкрываць свае імперыялістычныя планы рэкламным «клопатам» аб інтарэсах усяго «Заходняга паўшар'я», якое гэтыя паны гатовы зрабіць сваёй уласнасцю з усімі яго шматлікімі рэспублікамі і каланіяльнымі ўладаннямі іншых краін на прылягаючых да амерыканскага мацерыка астравах. Усё гэта нясе небяспеку далейшага расшырэння і далейшага распальвання вайны, з ператварэннем яе ў сусветную імперыялістычную вайну.

У гэтых умовах Совецкі Саюз павінен праявіць узмоцненую пільнасць да справы сваёй знешняй безапаснасці, да ўмацавання ўсіх сваіх унутраных і знешніх пазіцый. Мы правялі пераход з 7-гадзіннага на 8-гадзінны рабочы дзень і іншыя мерапрыемствы, лічачыся з тым, што мы абавязаны забяспечыць далейшы і яшчэ больш магутны ўздым абаронней і гаспадарчай магутнасці краіны, забяспечыць сур'ёзнае ўмацаванне дысцыпліны сярод усіх працоўных, узмоцнена працаваць над падняццем прадукцыйнасці працы ў нашай краіне. Мы маем немалыя новыя поспехі, але мы не збіраемся супакоіцца на дасягнутым. Каб забяспечыць патрэбныя нам далейшыя поспехі Совецкага Саюза, мы павінны заўсёды памятаць словы таварыша Сталіна аб тым, што «трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі застаць нас знянацку». **(Працяжныя апладысменты).** Калі ўсё мы будзем памятаць аб гэтым святым нашым абавязку, то ніякія падзеі нас не застануць знянацку і мы даб'емся новых і яшчэ больш слаўных поспехаў Совецкага Саюза. **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя авацыі. Усе ўстаюць).**

АБ УБОРЦЫ І ЗАГАТОЎКАХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДУКТАЎ

Пастанова Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Пастанова Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Соўнаркома Саюза ССР «Аб змяненнях у палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў» ад 7 красавіка 1940 г. забяспечыла далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, расшырэнне пасеўных плошчаў і стварыла моцную базу для паспяховага правядзення загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў. Паспяховае правядзенне ў бягучым годзе вясенніх палявых работ калгасамі і соўгасамі і добрае становішча пасеваў дазваляюць разлічваць на атрыманне высокага ўраджаю.

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР папярэджваюць партыйныя, совецкія і зямельныя органы аб недапушчальнасці паўтарэння мінулагодніх памылак, калі ў радзе рэспублік, краёў і абласцей, у выніку бясклопатных адносін кіраўнікоў мясцовых арганізацый, уборка празмерна зацягнулася, што прывяло да вялікіх страт ураджаю.

Пачатак уборкі зернавых культур паказвае, што гэтыя памылкі ў радзе раёнаў паўтараюцца і ў бягучым годзе. Да гэтага часу ў некаторых краях і абласцях, пачаўшых ужо ўборку ўраджаю зернавых культур, не закончан рамонт камбайнаў, трактараў і не адрамантаван конна-уборачны інвентар, а працуючыя камбайны не цалкам скарыстоўваюцца. Ёсць факты нескарыстання на ўборцы простых уборачных машын, асабліва ў перыяд васковай спеласці і пры выбарачнай уборцы зернавых на асобных паспеўшых участках, што прыводзіць да перастою зярна і яго асыпання.

Першыя вынікі загатовак зернавых культур з ураджаю 1940 года ў радзе паўднёвых раёнаў Саюза паказваюць, што мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі ў самым пачатку загатовак дапусцілі памылкі, якія прывялі да адставання здачы зярна дзяржаве ад ходу ўборкі і абмалоту.

Зноў паўтараецца меўшая месца ў мінулым годзе шкодная тэндэнцыя вельмі недастатковага скарыстання жывога цягла калгасаў і соўгасаў па вывазцы сельскагаспадарчых прадуктаў на дзяржаўныя заготпункты і спроба перакласці галоўную масу перавозак сельскагаспадарчых прадуктаў на дзяржаўны транспарт.

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР патрабуюць ад мясцовых партыйных, совецкіх арганізацый і ад Наркамзага не дапускаць паўтарэння недахопаў і памылак, меўшых месца ў мінулым годзе ў арганізацыі загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў, у асаблівасці ў Омскай, Чэлябінскай і Куйбышэўскай абласцях, Краснаярскім краі і Башкірскай АССР, дзе многія кіруючыя партыйныя і совецкія работнікі аказаліся ў палоне антыдзяржаўных тэндэнцый асобных калгасаў і калгаснікаў, у выніку чаго план хлебазагатовак быў недавыкананы і стварыліся значныя нядоімкі па абавязковых пастаўках зернавых культур і натураплаце за работы.

У мэтах правядзення ў сціслыя тэрміны ўборачных работ, недапушчэння страт ураджаю, а таксама своечасовага і поўнага выканання дзяржаўнага плана загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў, ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР абавязваюць партыйныя, совецкія, комсамольскія, зямельныя і загатоўчыя органы шырока мабілізаваць масы калгаснікаў, работнікаў МТС, соўгасаў і загатоўчага апарата на своечасовае правядзенне ўборачных работ і па выкананне дзяржаўных планаў загатовак ва ўстаноўленыя ўрадам тэрміны.

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР абавязваюць Наркамзем, Наркамзаг, Наркамсоўгасаў, Наркамхарчпром, Наркаммясамолпром СССР, ЦК компартый саюзных рэспублік, Соўнаркомы рэспублік, краявыя, абласныя і раённыя камітэты партыі і комсамола і выканаўчыя камітэты Советаў дэпутатаў працоўных, дырэктараў МТС, соўгасаў і старшынь калгасаў:

I. Па ўборцы зернавых і маслічных культур

1. Поўнасцю закончыць па МТС і соўгасах рамонт трактараў, аўтаперасовак, малатарань, лакамабіляў, аўтамашын і ўсіх наяўных уборачных машын, абсталяваўшы ў раёнах, дзе мае месца палягание збожжа, камбайны і іншыя ўборачныя машыны прыстасаваннямі для ўборкі палёгшага збожжа.

2. Не дапускаць перастою зернавых на корані і іх асыпанне, для чаго арганізаваць старанны нагляд у брыгадах за паспяванням асобных участкаў збожжа з тым, каб не чакаючы паспявання ўсяго масіва, забяспечыць выбарачную ўборку камбайнамі і простымі машынамі на ўчастках з паспеўшым збожжам.

3. Да ўборкі камбайнамі каласавога збожжа прыступіць у пачатку поўнай спеласці, а простымі машынамі — у перыяд васковай спеласці зярна, забяспечыўшы работу камбайнаў на ўборцы і работу праспейшых машын на зменных конях не менш 16 гадзін у суткі.

4. Арганізаваць следам за касавіцай неадкладную вязку снапоў і складание іх у копы, бабкі і крыжы. Забяспечыць уборку саломы і сціртаванне яе неадкладна следам за ўборкай збожжа камбайнамі.

Устанавіць, што сціртаванне збожжа, убранага простымі машынамі, павінна быць закончана не пазней, чым за дзесяць дзён пасля скончання касавіцы.

5. Не дапускаць спазнення з абмалотам збожжа і забяспечыць пачатак абмалоту збожжа не пазней пяці дзён пасля пачатку касавіцы, арганізаваўшы ў першую чаргу малацьбу з копаў. Забяспечыць работу малатарань МТС і соўгасаў не менш 20 гадзін у суткі. Забараніць абмалот збожжа на старых токах без папярэдняга іх выжыгання або абеззаражвання.

6. Для бесперабойнай работы камбайнаў выдзеліць лепшыя трактары, своечасова замацаваць на ўвесь час уборкі за кожным камбайнавым агрэгатам пастаянны састаў калгаснікаў для падвозу гаручага і вады, ачысткі, сушкі і перавозу зярна, сціртавання саломы, выдзеліўшы неабходную колькасць коней і павозак, а таксама замацаваць лабагрэйкі для пракосу загонаў і абкашвання вуглоў.

7. Забяспечыць у перыяд хлебаўборкі старанны догляд за камбайнамі і трактарамі, абсталяваць у кожнай МТС і ў кожным соўгасе па дзве-тры аўтаперасовачных майстэрні і ўкамплектаваць гэтыя майстэрні кваліфікаванымі тэхнічнымі кадрамі, а таксама неабходным інструментам і запаснымі часткамі.

8. Устанавіць старанны кантроль за якасцю ўборкі збожжа, не дапускаючы ўборкі камбайнамі на высокім зрэзе, не гнацца толькі за колькасцю гектараў пры ўборцы палёгшага збожжа пры густым хлебастоі, змяншаючы пры гэтым шырыню захвату хедэрам. На ўсіх плошчах уборкі, следам за скашваннем, абавязкова праводзіць падборку калоссяў, якія асталіся на полі.

9. Падрыхтаваць у кожнай паляводчай брыгадзе да пачатку ўборкі токі для малацьбы і крытыя навесы, не дапускаючы захоўвання зярна на некрытых токах. Закончыць рамонт і будаўніцтва зернесушылак.

10. Устанавіць у калгасах і соўгасах абавязковае ўзважванне збожжа, атрыманага ад абмалоту і ўборкі камбайнамі, а таксама пры вывазцы збожжа на загатоўчыя пункты і склады калгасаў.

Ускласці адказнасць за захаванне зярна на токах па кожнай брыгадзе — на брыгадзіра, а па калгасу ў цэлым — на старшыню калгаса.

11. Устанавіць, што брыгадзіры паляводчых брыгад калгаса абавязаны штодзённа асабіста праводзіць прыёмку ўбраных участкаў, а старшыні калгасаў — прыёмку ад брыгадзіраў не пазней трох дзён пасля скончання работы на даным участку. У соўгасах прыёмку ўбраных плошчаў павінны праводзіць дырэктары соўгасаў або кіраўнікі аддзяленняў і фермамі. Прыёмка ўчасткаў павінна афармляцца актамі з ацэнкай якасці работы.

12. Скарыстаць на ўборцы ўраджаю 1940 года ўсе простыя машыны і прылады вытворчасці, якія ёсць у калгасах, МТС і соўгасах.

Для паскарэння малацьбы ў калгасах, абслугоўваемых МТС, скарыстаць у МТС малатарні соўгасаў пасля скончання ў іх малацьбы.

Пасля скончання ўборкі ўраджаю камбайнамі скарыстаць камбайны на стацыянарнай малацьбе.

13. Не дапускаць абсыпання збожжа з-за прастояў камбайнаў па няспраўнасці. У выпадках прастояў камбайнаў па віне МТС дазволіць калгасам праводзіць уборку збожжа простымі машынамі незалежна ад таго, што даны масіў быў выдзелен для камбайнавай уборкі.

Пры дапушчэнні камбайнерам страты ўраджаю з-за высокага зрэзу і дрэннай рэгуліроўкі камбайна дазволіць дырэктарам МТС і соўгасаў зніжаць да 30 процантаў аплату камбайнера за нядобраякасна ўбраны ўчастак.

14. Ліквідаваць грубейшую памылку, якая заключаецца ў тым, што ў парку МТС адсутнічаюць жаткі-лабагрэйкі, жаткі-самаскідкі і іншыя простыя сельскагаспадарчыя ўборачныя машыны, якія могуць дапоўніць камбайны і адыгрываць істотную ролю пры іх, а выпушчаныя жаткі і іншыя простыя ўборачныя машыны прадаюцца калгасам замест перадачы іх МТС. З гэтай мэтай:

а) увесці ў спісак машын, уваходзячых у парк МТС, побач з камбайнамі, жаткі-лабагрэйкі, жаткі-самаскідкі і снопавязалкі;

б) абавязаць Наркамзем СССР у дакладны тэрмін прадставіць на зацверджанне ЦК ВКП(б) і СНК СССР план павелічэння вытворчасці жатак-лабагрэек, жатак-самаскідак і снопавязалак;

в) усе новавыпускаемыя з вытворчасці жаткі-лабагрэйкі, жаткі-самаскідкі і снопавязалкі перадаваць выключна МТС для папаўнення парка ўборачных машын.

15. У мэтах правядзення ўборкі ў сціслыя тэрміны, рэкамендаваць калгасам у першыя 15—20 дзён уборкі і абмалоту збожжа калгаснікам, занятым на абслугоўванні камбайнаўборкі, на касавіцы простымі ўборачнымі машынамі і ўручную, на вязцы, укладцы, возцы снапоў, на сціртаванні збожжа і саломы, на падграбанні калоссяў, на зернеачыстцы, а таксама на ўсіх работах па абмалоту і вывазцы зярна дзяржаве, — налічаць працадні пры выкананні дзённай нормы ў двайным размеры супроць існуючых у калгасе расцэнак.

16. Прапанаваць калгасам налічаць у выглядзе заахвочвання брыгадзірам паляводчых брыгад, закончыўшым у брыгадзе ўборку зернавых культур не пазней чым у 20 календарных дзён, двайную аплату працадзён за ўборачны перыяд.

17. Устанавіць, што механікі МТС і соўгасаў, забяспечыўшыя спраўную работу камбайнаў і выкананне замацаванымі за імі камбайнамі плана ўборкі збожжа ў тэрмін не больш 20 дзён, атрымліваюць прэмію ў размеры двухмесячнага аклада і пры ўборцы камбайнамі позніх культур у тэрміны, прадугледжаныя планам, атрымліваюць прэмію ў размеры месячнага аклада з прэміяльных фондаў МТС і соўгасаў.

18. Для забеспячэння калгасаў і соўгасаў сартавым насеннем з ураджаю, сабранага з насенных участкаў, арганізаваць асабліва старанную ўборку зернавых культур у райнасенгасах і на насенных участках калгасаў і соўгасаў, выдзеліўшы для ўборкі лепшыя камбайны і найбольш вопытных камбайнераў. Уборку насенных участкаў рабіць у 5—7 дзён пасля наступлення поўнай спеласці зярна, не дапускаючы змешвання сартоў і катэгорый зярна пры ўборцы, малацьбе, перавозцы, ачыстцы і захоўванні насеннага зярна.

19. Аддаючы асаблівае значэнне Указу Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб забароне самавольнага ўходу з работы трактарыстаў і камбайнераў, працуючых у машынна-трактарных станцыях», для забеспячэння паспяховай работы МТС абавязаць абкомы, крайкомы і ЦК компартый саюзных рэспублік прасачыць за дакладным яго выкананнем.

20. Забяспечыць у калгасах, МТС і соўгасах поўнае скарыстанне ўсіх калгаснікаў, рабочых МТС і соўгасаў і іх рабочага часу на ўборцы і на справе пакончыць з недапушчальнай практыкай у некаторых калгасах, МТС і соўгасах, калі калгаснікі і работнікі МТС і соўгасаў замест таго, каб пачынаць работу да 5—6 гадзін раніцы выходзяць на ўборачныя і палявыя работы ў 8—9 гадзін і канчаюць работу ў полі раней заходу сонца.

Праверыць і забяспечыць па калгасах, МТС і соўгасах абсталяванне палявых станаў, кухань, арганізацыю харчавання ў полі з тым, каб калгаснікі, работнікі МТС і соўгасаў не былі вымушаны вярнуцца на абед і на ноч у сяло і траціць на гэта дарагі рабочы час.

21. Прызнаць няправільным, калі ў калгасах пасля выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай усё зярно і значная частка кармоў раздаюцца па працаднях, у выніку чаго калгас астаецца без усякіх запасных страхавых насенных, харчовых і фуражных фондаў на выпадак неўраджаю ў наступны год. Прапанаваць калгасам забяспечыць правільнае скарыстанне сабранага ўраджаю з тым, каб пасля выканання ўсіх абавязацельстваў калгасамі перад дзяржавай і засыпкі насення былі створаны ў калгасах на выпадак неўраджаю страхавыя насенныя, харчовыя і фуражныя фонды.

22. Устанавіць, што насенны страхавы фонд зернавых культур у калгасах з ураджаю 1940 года ствараецца ў размеры 15 процантаў гадавой патрэбнасці, а ў калгасах засушлівых абласцей, а іменна: Саратаўскай, Сталінградскай, Куйбышэўскай, Чкалаўскай, Заходне-Казахстанскай, Акцюбінскай абласцей і АССР Немцаў Паволжа — у размеры 20 процантаў гадавой патрэбнасці.

Стварыць з ураджаю 1940 года ў калгасах харчовы страхавы фонд у размеры 2 процантаў ад валавога збору харчовых культур.

Устанавіць, што пасля выканання ўсіх сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай (зварот пазык, зернепастаўкі, пагашэнне нядоімак, натураплата) праўленне калгаса і, перш за ўсё старшыня калгаса, абавязаны стварыць усе ўстаноўленыя грамадскія фонды зернавых культур (насенны і фуражны фонды, насенны страхавы фонд, харчовы страхавы фонд, фонд дапамогі) і толькі пасля стварэння іх прыступіць да размеркавання зернавых культур па працаднях звыш тых колькасцей, якія ў парадку авансаў выданы калгаснікам па працаднях.

23. Абавязаць Наркамсрэдмаш, Наркамтэкстыль, Наркамчормет і Наркамхімпром закончыць поўнасцю ў бліжэйшыя дні адгрузку запасных частак, брэзентавай тканіны, мяхоў, шпагату, метала і гумы Наркамзему, Наркамзагу і Наркамсоўгасаў СССР у тэрміны, устаноўленыя Эканомсоветам пры Соўнаркоме СССР.

24. Забяспечыць правядзенне праполкі і рыхлення міжраддзяў сланечніка і іншых маслічных культур аж да самай іх уборкі, не аслабляючы работ па догляду за імі ў перыяд уборкі зернавых культур.

25. Уборка сланечніка ў кожным калгасе павінна быць праведзена на працягу 6—8 дзён з моманту паспявання. Закончыць першую зрэзку кісцей клешчавіны на працягу двух дзён і ўборку ільнукудраша і іншых маслічных культур на працягу 4—5 дзён.

26. Своечасова правесці ўборку сланечніка і не дапускаць паўтарэння памылак мінулага года, калі ў выніку непрынятця мер к своечасовай уборцы было дапушчана вялікае асыпанне сланечніка. Прыняць усе меры да таго, каб камбайны, працуючыя на ўборцы сланечніка, былі абсталяваны спецыяльнымі прыстасаваннямі.

27. Забараніць калгасам і соўгасам захоўванне насення маслічных культур на адкрытых токах, абавязаўшы іх рабіць неадкладную ачыстку масласемя, у асаблівасці паступаючага з-пад камбайна, забяспечыўшы здачу на загатоўчыя пункты добраякаснага масласемя.

II. Па загатоўцы зернавых і маслічных культур

1. У найкарацейшы тэрмін закончыць уручэнне абавязацельстваў па пастаўках зернавых і маслічных культур дзяржаве ў тых раёнах, у якіх гэтая справа зацягнулася і яшчэ не закончана.

2. Аказаць неабходную дапамогу ўпаўнаважаным Наркамзага ў абласцях, краях і рэспубліках у іх рабоце па аднясенню калгасаў да разрадаў ураджайнасці, прадастаўляючы часова ў іх распараджэнне неабходную колькасць праверанных работнікаў і прасякаючы пры гэтым усякія антыдзяржаўныя спробы, накіраваныя да заніжэння ўраджайнасці калгасаў і, тым самым, да штучнага зніжэння размераў натураплаты.

3. Устанавіць, што ўручэнне рахункаў калгасам за работы МТС робіцца не пазней тыднёвага тэрміна пасля атрымання паведамленняў ад упаўнаважанага Наркамзага аб аднясенні калгасаў да разрадаў ураджайнасці, а за касьбу, камбайнавую ўборку, малацьбу і зерноачыстку — не пазней тыднёвага тэрміна з дня праведзенай МТС работы.

Папярэдзіць дырэктараў МТС аб іх асабістай адказнасці перад дзяржавай за правільнасць налічэнняў натураплаты, своечасовае ўручэнне рахункаў калгасам за выкананыя МТС работы і здачу зярна калгасамі па ўручаных рахунках.

4. Забяспечыць здачу калгасамі і соўгасамі вусім добраякаснага зярна, рысу, сланечніка і іншых маслічных культур, арганізаваўшы старанную ачыстку зярна, у асаблівасці паступаючага з-пад камбайнаў, а таксама своечасовую прасушку вільготнага і сырога зярна сіламі і сродкамі калгасаў і соўгасаў.

5. Дазволіць Наркамзагу спагнаць зернавымі культурамі па эквіваленту цэнтнер за цэнткер з дашлатай розніцы ў цане грашыма:

а) насенную ссуду сланечніка, выданую соўгасам і калгасам для сяўбы на сілос;

б) запазычанасць па сланечніку і іншых маслічных культурах, якая лічыцца за калгасамі, не маючымі пасеваў маслічных культур у 1940 годзе.

6. Устанавіць, што з першых партый зернавых і маслічных культур, здаваемых калгасамі і соўгасамі дзяржаве, у першую чаргу паташаюцца атрыманыя калгасамі і соўгасамі ад дзяржавы насенная, харчовая і фуражная ссуды.

Пагашэнне нядоімак мінулых год зярна, рыса і маслічных культур па абавязковых пастаўках і натураплаце за работы МТС павінна быць зроблена ў тэрміны і парадку, устаноўленыя для абавязковых паставак.

7. Устанавіць, што здача зярна, сланечніка і іншых маслічных культур па абавязковых пастаўках і натураплаце за работы МТС (апрача малацьбы) калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнымі гаспадаркамі павінна праводзіцца ў дакладнай адпаведнасці з уручанымі абавязацельствамі і рахункамі за работы МТС, а іменна: пшаніца, рыс, бабовыя, грэчка, проса і жыта ў размерах, устаноўленых уручанымі абавязацельствамі па пастаўках і рахунках за работы МТС для кожнай з гэтых культур, па іншых зернавых культурах у размерах, устаноўленых абавязацельствамі і рахункамі для гэтых культур з правам здачы любой культуры па выбару здатчыка, а па маслічных культурах у размерах, устаноўленых абавязацельствамі і рахункамі за работы МТС для гэтых культур з правам замены адных культур іншымі, у адпаведнасці з устаноўленымі законам эквівалентамі замены.

8. Засыпка калгасамі насенных фондаў да выканання збожжаздачы можа праводзіцца толькі з насенных участкаў, размер якіх не павінен перавышаць: па азімай пшаніцы і жыту — 12 процантаў, па аўсу і ячменю — 13 процантаў, па яравой пшаніцы, просу і грэчцы — 15 процантаў, па кукурузе — 3 процанты, па сланечніку і іншых маслічных культурах не больш 5 процантаў ад пасеўных плошчаў адпаведных культур.

Забараніць засыпку насенных фондаў з агульных пасеваў калгасаў да выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Устанавіць, што пасля поўнай засыпкі насенных і страхавых фондаў у выпадку, калі астаюцца лішкі зярна, сабранага з насенных участкаў калгасаў і соўгасаў, лішняе зярно з насенных участкаў можа быць скарыстана калгасамі і соўгасамі для выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай, а пасля выканання гэтых абавязацельстваў — для іншых патрэб.

9. Устанавіць на час уборкі і да выканання плана загатовак адлічэнні зярна, рыса і сланечніка для выдачы авансам калгаснікам і на ўнутрыгаспадарчыя патрэбы калгасаў у размеры па зярну — 15 проц., па рысу і сланечніку —5 процантаў ад фактычна зданай на дзяржаўныя загатоўчыя пункты колькасці зярна, рыса і сланечніка.

Арганізаваць строгі кантроль за захаваннем устаноўленых норм адлічэнняў для выдачы авансаў і на ўнутрыгаспадарчыя патрэбы калгасаў, прасякаючы ўсякія факты нарушэння іх у старану завышэння, і прыцягваць вінаватых да адказнасці як за дэзарганізацыю хлебазагатовак і разбазарванне збожжа.

10. Забяспечыць своечасовае і поўнае выкананне соўгасамі планаў здачы зярна, сланечніка і іншых маслічных культур ва ўстаноўленыя тэрміны, а таксама абавязковую здачу дзяржаве на ўмовах хлебазакупак усіх лішкаў зярна і рыса, якія могуць аказацца ў соўгасах пасля выканання плана здачы зярна дзяржаве, звароту ссуд і засыпкі насенных і фуражных фондаў у адпаведнасці з промфінпланамі соўгасаў.

11. Забараніць практыку скарыстання жывога цягла калгасаў і соўгасаў у перыяд загатовак на абслугоўванне патрэб, не звязаных з загатоўкамі і палявымі работамі.

Устанавіць пяцідзённыя заданні раёнам і калгасам па вывазцы зярна, буракоў, бульбы і гародніны тужавым транспартам, забяспечыўшы сістэматычны кантроль за выкананнем заданняў.

12. Прывесці ў поўную гатоўнасць загатоўчыя пункты, склады, элеватары і зернесушылкі, закончыўшы да паступлення новага зярна рамонт і дэзінфекцыю зернесховішч, інвентара, ватавай гаспадаркі і забяспечыць элеватары і зернесушылкі неабходным запасам паліва.

13. Устанавіць, што асобы, вінаватыя ў дапушчэнні захавання хлеба ў бунтах, без асобага на тое дазволу ў выключных выпадках урада СССР, будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасці як нарушыцелі закона.

14. НКПЗ і Наркамзагу ў перыяд масавага паступлення збожжа арганізаваць паязды-вяртушкі ўнутры чыгунак і ў парадку аператыўнага рэгулявання, у межах агульнага плана перавозак хлеба, павялічваць падачу вагонаў на перагружаныя хлебам загатоўчыя пункты за лік адпаведнага скарачэння плана падачы вагонаў іншым менш загружаным хлебам загатоўчым пунктам.

15. Ліквідаваць недапушчальную практыку прастояў вагонаў і асабліва барж пад пагрузкай і разгрузкай хлеба.

16. Забараніць скарыстанне аўтамашын «Союззаготтранса» на перавозку іншых грузаў, не звязаных з загатоўкай сельскагаспадарчых прадуктаў, аж да поўнага заканчэння вывазу збожжа, буракоў і іншых загатаўляемых сельскагаспадарчых прадуктаў.

Устанавіць, што машыны «Союззаготтранса» павінны скарыстоўвацца ў першую чаргу на вывазцы зярна з глыбінных загатоўчых пунктаў «Заготзярно» і з калгасаў, аддаленых ад чыгунак і прыстаней, а ў бурачных раёнах — на вывяз буракоў з калгасаў, якія знаходзяцца на адлегласці звыш 15 кілометраў ад загатоўчых пунктаў.

Прадаставіць «Союззаготтрансу» першачарговае права на атрыманне аплаты за перавозку сельскагаспадарчых прадуктаў калгасаў з іх рахункаў у банку.

17. Забяспечыць праезджы стан дарог, што ідуць да загатоўчых пунктаў на працягу ўсяго перыяда перавозак збожжа.

18. Ліквідаваць адставанне будаўніцтва зернавых складаў, забяспечыўшы гэта будаўніцтва поўнасцю рабочай сілай і мясцовымі будаўнічымі матэрыяламі.

19. Забараніць загатоўчым пунктам вяртаць назад здаваемае дзяржаве зярно, заражонае кляшчом.

У выпадку дастаўкі на загатоўчыя пункты зярна, заражонага кляшчом, пункты прымаюць гэта зярно ад калгасаў, соўгасаў і аднаасобных гаспадарак са скідкай з вагі ў размеры 2 процантаў і з цаны — 30 капеек з аднаго цэнтнера, з умоваю асобнага яго захавання і з наступнай падпрацоўкай.

20. Строга сачыць за чыстатой складах, загатоўчых пунктах, зернесвішчах, своечасова падпрацоўваць зярно, не дапускаючы сагравання, псавання, заражэння шкоднікамі.

III. Па ўборцы і загатоўках бульбы і гародніны

1. Забяспечыць міжрадную апрацоўку, барацьбу з сельгасшкоднікамі, а там, дзе неабходна, і паліўку на пасевах бульбы, гародніны і насенніках гэтых культур аж да ўборкі іх ураджаю.

2. Правесці апрабацыю пасеваў бульбы, прызначаных на насенныя мэты, і таксама ўсіх насенневодчых пасеваў культур гародніны, забяспечыўшы правядзенне прачысткі насенневодчых пасеваў ад хворых раслін і прымесей іншых сартоў.

3. Правесці ўборку бульбы, гародніны і насеннікаў гэтых культур у кароткія тэрміны, да надыходу асенніх замаразкаў.

4. Забараніць калгасам, калгаснікам і аднаасобным гаспадаркам продаж на старану бульбы аж да выканання сваіх абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве.

5. Захаваць на 1940 год парадак, што дзейнічаў у 1939 годзе, па якому рабочыя, служачыя, каапераваныя саматужнікі гарадоў і рабочых пасёлкаў да абавязковых паставак бульбы не прыцягваюцца.

6. Падрыхтаваць навесы, склады, сховішчы, тару і вагі для прыёмкі і захавання бульбы і гародніны, а таксама пункты па засолцы, квашэнню і перапрацоўцы гародніны, закончыўшы рамонт і новае будаўніцтва не пазней 20 жніўня 1940 года, а таксама прыстасаваць для захавання бульбы падвалы гарадскіх дамоў да 1 верасня 1940 года.

Устанавіць на перыяд масавага паступлення бульбы і гародніны кругласутачную работу загатоўчых пунктаў.

7. Развіць сушку гародніны і бульбы, зацвердзіўшы як мінімальнае заданне план вытворчасці сушонай бульбы і гародніны з ураджаю 1940 года ў размеры 16 тысяч тон супроць 9.600 тон у 1939 годзе, замацаваўшы за сушыльнымі прадпрыемствамі адпаведныя зоны загатовак бульбы і гародніны.

8. Забяспечыць арганізацыю захавання бульбы і гародніны ў свежым выглядзе, звярнуўшы асаблівую ўвагу на скарыстанне прасцейшых спосабаў захавання ў траншэях і буртах.

У глыбінных пунктах захаванне бульбы ў буртах да вясны ўскласці на спажыўкааперацыю, арганізаваўшы інструктаж сельпо, праверыўшы падрыхтаванасць кадраў, загатовіць неабходную колькасць саломы для забеспячэння належнага якаснага захавання без страт.

Арганізаваць захаванне ў калгасах ранняй бульбы, прызначанай для перапрацоўкі спіртавымі і крухмалапатачнымі заводамі, з завозам яе на заводы па ўстаноўленні саннай дарогі, а таксама вясной.

9. Рэкамендаваць праўленням калгасаў па рашэнню агульнага схода калгаснікаў здаваць дзяржаве бульбу з атрамаджанай пасеваў у лік выканання калгаснікамі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай за сваіх прысядзібных участкаў, дзяржаве, праўленні калгасаў прадастаўляюць транспарт для вывазкі бульбы з загатоўчыя пункты.

10. Устанавіць, што калгасы, побач з выкананнем дзяржаўных паставак бульбы размяркоўваюць па працаднях і, у першую чаргу, сярод тых, хто працуе на выбіранні і вывазцы бульбы, 10 процантаў ад зданай дзяржаўным загатоўчым пунктам колькасці бульбы.

11. Устанавіць, што мясцовыя партыйныя, совецкія і загатоўчыя арганізацыі нясуць поўную адказнасць за забеспячэнне насельніцтва гарадоў і прамысловых цэнтраў на асенні, зімовы і веснавы перыяды бульбай, гародніной і пладамі, таксама за арганізацыю зататовак і стварэнне неабходных запасаў дзікарастучых ягад, пладоў, грыбоў і мёду.

Устанавіць, што ²/₃ загатоўленай колькасці дзікарастучых ягад, пладоў, грыбоў і мёду астаецца ў распараджэнні мясцовых арганізацый для гандлю.

12. Захаваць за Наркамзагам права дазваляць замену здачы бульбы зярна па ўстаноўленаму законам эквівалентнага для соўгасаў плана здачы бульбы і гародніны ў тэрміны, устаноўленыя для абавязковых пастаўках для калгасаў.

IV. Па ўборцы ільну і канапель

1. Скарыстаць на ўборцы ільну і канапель усе ільноцерабільныя і каноплеўборачныя машыны, забяспечыўшы цераблене ільну і канапель у тэрмін не больш 7—10 дзён.

2. Улічваючы наяўнасць у бягучым годзе многагаруснасці на пасевах ільну, абавязаць дырэктароў МТС і старшынь калгасаў забяспечыць старанны адбор участкаў па найбольш выраўненых сцебластоях для машыннага цераблення ільну.

3. Закончыць рассціл і мочку ўсяго ўраджаю ільну поўнасцю ў жніўні месяцы, а мочку канапель у верасні месяцы.

Дазволіць калгасам Архангельскай, Валагодскай, Кіраўскай, Молатаўскай, Новасібірскай, Омскай і Іркуцкай абласцей, Алтайскага і Краснаярскага краёў, Комі і Удмурцкай АССР пераносіць рассціл да 30 процантаў абмалочанага ільну на наступны год з абавязковай здачай дзяржаве гэтай прадукцыі не пазней 15 жніўня.

4. Забяспечыць не пазней першага верасня рамонт усіх сушылак і мяльна-трапальных машын па ільну і канаплях у МТС і калгасах і забяспечыць поўнае іх скарыстанне на першапачатковай апрацоўцы ільну і канапель.

Устанавіць прэміраванне дырэктароў, механікаў МТС у размеры 1,5 процанта месячнай зарплаты за кожны процант перавыканання сезоннага плана машыннай апрацоўкі ільну і канапель пры ўмове выканання заданняў па якасці валакна.

5. Абавязаць праўленні калгасаў калгасах, не забяспечаных добрымі сялішчамі, шырока прымяняць халодна-водную мочку ільну.

6. Прапанаваць калгасам, маючым посевы ільну і канапель, налічаць калгаснікам у першыя 5—7 дзён работы пераробленні ільну і ўборцы канапель працадні ў двайным размеры.

7. Рэкамендаваць калгасам налічваць брыгадзірам паляводчых брыгад пры перавыкананні плана здачы ільноканоплепродукцыі ў цэлым па брыгадзе прэмії-надбаўкі ў размеры сярэдняй прэміі, атрымліваемай членамі звяна яго брыгады.

8. Дазволіць прымаць ад калгаснікаў лік выканання абавязковых паставак дзяржаве насенне канапель з разліку адзін цэнтнер насення канапель за три цэнтнеры зярна.

V. Па ўборцы і загатоўцы цукровых буракоў

1. Не спыняць догляду за буракамі ў час уборкі зернавых культур, арганізаваўшы на працягу ўсяго перыяда росту буракоў праполкі іх ад пустазелля, правядзенне глыбокіх міжрадковых рыхленняў, а таксама барацьбу са шкоднікамі.

2. Закончыць да 1 верасня рамонт буракапад'ёмнікаў, вазоў, выраб неабходнага ўборачнага інвентара (мерніцы, маты для ачысткі), рамонт і будаўніцтва мастоў і дарог для вывазу буракоў на пункты здачы.

3. Рэкамендаваць праўленням калгасаў павялічыць у два разы налічэнне працадзён на работах па догляду за буракамі з 1 па 25 жніўня пры ўмове выканання дзённай нормы выпрацоўкі, а таксама ўстанаўліваць дадаткова да існуючай сістэмы аплаты і прэміравання налічэння працадзён звенням за кожныя атрыманыя звыш плана 2 цэнтнеры буракоў у размеры аднаго працадня і выдаваць 50 процантаў сумы прэмій-надбавак, атрыманай калгасам за цукровыя буракі, звенням, здаўшым па кантрактацыі з гектара буракоў не менш той колькасці, пры здачы якой калгас атрымлівае прэміяльную надбаўку.

4. Устанавіць пачатак масавай копкі цукровых буракоў 20—25 верасня з тым, каб у зонах цукровых заводаў, забяспечаных буракамі на працяжны перыяд работы, пачаць масавую копку буракоў 10—15 верасня, а ў Казахскай, Кіргізскай ССР з 25 жніўня, Алтайскім краі з 1 верасня і Краснадарскім краі з пачатку верасня.

У адпаведнасці з графікам пуску цукровых заводаў пачаць копку з такім разлікам, каб да пачатку пуску заводаў мелася не менш пяцідзённага запасу буракоў на тэрыторыі завода, а затым была забяспечана бесперабойная загрузка цукровых заводаў буракамі.

5. Закончыць копку і возку цукровых буракоў у наступныя тэрміны:

	копку	возку
Па Украінскай ССР	30 кастрычніка	10 лістапада
Па Варонежскай, Курскай, Орлоўскай, Пензенскай, Разанскай, Саратаўскай, Тамбоўскай, Тульскай абласцях, Прыморскаму краю і Башкірскай АССР	25 кастрычніка	5 лістапада
Па Алтайскаму краю і Новасібірскай абласці	10 кастрычніка	25 кастрычніка
Па Кіргізскай і Казахскай ССР	5 лістапада	25 лістапада
Па Грузінскай, Армянскай ССР і Краснадарскаму краю	5 лістапада	15 лістапада.

6. План палявога кагатыравання цукровых буракоў, пасля зацвярджэння яго Соўнаркомам Саюза ССР, давесці да калгасаў з тым, каб заданне па палявому кагатыраванню атрымалі тыя калгасы, якія па стану транспартных сродкаў не могуць забяспечыць вывазку буракоў ва ўстаноўлены тэрмін.

Вывазку буракоў в палявых кагатаў рабіць па нарадах і ў тэрміны, указаныя цукровымі заводамі.

7. Забяспечыць да 25 жніўня падрыхтоўку загатоўчых пунктаў да прыёмкі і захавання цукровых буракоў, выраб неабходнай колькасці мат для ўкрыцця буракоў на цукровых заводах і пунктах прывядзення ў парадак пад'ездаў да прыёмачных пунктаў і укамплектаванне кадрамі (кагатчыкамі, прыёмшчыкамі, вагаўшчыкамі).

VI. Па ўборцы і загатоўцы бавоўны

1. Забяспечыць добры догляд за пасевамі бавоўны, які асабліва неабходзен у сувязі з позняе яе развіццём.

Рэкамендаваць калгасам на перыяд з 1 па 20 жніўня налічаць працадні калгаснікам, занятым на акучцы бавоўны, у двайным размеры пры выкананні імі дзённай нормы выпрацоўкі і захаванні ўстаноўленай якасці акучвання.

2. Для забеспячэння кругласутачнага скарыстання паліўной вады, рэкамендаваць калгасам налічаць працадні ў двайным размеры за начныя паліўкі бавоўны на працягу жніўня, пры выкананні ўстаноўленых норм выпрацоўкі і якасці паліўкі.

3. Забяспечыць не пазней 15 верасня заканчэнне рамонту і прывядзенне ў поў-

Працяг на 3-й стар.

АБ УБОРЦЫ І ЗАГАТОЎКАХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДУКТАЎ

Пастанова Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

парадак усіх калгасных і заводскіх ўнасушылак, забяспечыўшы іх неабным запасам паліва.

. Закончыць вывазку астатка бавоўсырца ўраджаю мінулых год з загатых пунктаў на заводы не пазней 1 сня з тым, каб да паступлення баны-сырца новага ўраджаю былі поўцю адрамантаваны, ачышчаны і прадэзінфіцыраваны ўсе склады і памяшканні пад бавоўну новага ўраджаю.

5. Забяспечыць пры ўборцы ўраджаю бавоўны абавязковы раздзельны збор бавоўны па сартах з захаваннем устаноўленага стандарта, не дапускаючы змешвання несаспеўшай бавоўны, а таксама заражонай бавоўны са здаровай.

VII. Па табаках і махорцы

. Устанавіць, што ўборка табакоў пагта праводзіцца пры наяўнасці поўнай нічнай спеласці строга па ярусах, дапускаючы пераспявання табакоў, а сама збора недаспеўшых лістоў.

. Забяспечыць своечасовае і паслянае выкананне работ па ўборцы таў (ломка, нізка, сушка, апрацоўка), дапускаючы разрыву паміж гэтымі отамі.

3. Адрамантаваць і прывесці ў поўную ўнасць да 20 жніўня ўсе навесы, ныя сараі і агнесушылкі, скарысшы таксама для сушкі табакоў і маі прасцейшыя сушыльныя прыстаанні.

. Правесці ўборку ўраджаю табакоў і оркі ў наступныя тэрміны:

) махоркі — не пазней 10 верасня ўсіх раёнах, за выключэннем Алтайга і Краснаярскага краёў і Новасібірскай вобласці, дзе ўборку закончыць не пазней 1 верасня;

б) жоўтых табакоў — не пазней 1 кастрычніка, а па Украінскай, Казахскай, Кіргізскай ССР, Сталінградскай, Варонежскай і Орлоўскай абласцях — не пазней 20 верасня.

5. Для стымуліравання работы калгаснікаў, занятых непасрэдна па догляду, уборцы і першапачатковай апрацоўцы табачна-махорчанай сыравіны, рэкамендаваць калгасам выдзяляць з атрыманых прэмій-надбавак за перавыкананне плана кантрактацыі табакоў і махоркі для размеркавання сярод гэтых калгаснікаў, у залежнасці ад колькасці выпрацаваных працадзён, па табаках — 30 процантаў і махорцы — 50 процантаў.

6. Дабіцца выканання плана здачы табаку ва ўстаноўленыя ўрадам тэрміны з тым, каб быў павялічан выхад высокіх сартоў табаку.

VIII. Па кармавых культурах

1. Правесці ва ўсіх калгасах і соўгасправерку становішча насеннікаў многетніх траў і забяспечыць поўную іх лістку ад пустазелля.

2. Для недапушчэння асыпання нагня траў забяспечыць уборку насеннікаў нюшыны, люцэрны, цімафееўкі і жытка не больш, чым у пяць дзён, закончыць абмалот насеннікаў траў на працяг 20 дзён з пачатку касавіцы, своечасова прыстасаваўшы неабходную колькасць мбайнаў, малатарань і іншых машын уборкі, абмалоту і выцірання насенніў многалетніх траў.

3. Дазволіць Наркамзему і Наркамсоўгаў СССР распаўсюдзіць аплату, устаўленую для камбайнераў на ўборцы нанікаў люцэрны, на камбайнавую ўборку ннікаў канюшыны, жытняка, амерыканскага пырэя і іншых многалетніх траў.

4. Забяспечыць правядзенне другога осу на плошчах, маючых добры травой пасля зняцця першага ўкосу.

5. Рэкамендаваць калгасам налічаць ацдні ў двайным размеры калгаснікам, нятым на ўборцы, абмалоце і выціранні огалетніх траў, пры выкананні нормы працоўкі пры ўмове, калі ўборка, абмат і выціранне многалетніх траў па ыгадах або звеннях будуць закончаны ў ацпланідзённы тэрмін з пачатку касавіцы.

6. Прыняць меры да поўнага выкананя плана паставак сена дзяржаве ва ўстаўленыя ўрадам тэрміны.

Калгасам забяспечыць правільнае скарыстанне сабранага ўраджаю сена з тым, каб пасля выканання абавязацельстваў калгасамі перад дзяржавай былі створаны ў калгасах страхавыя фуражныя фонды, па сену не менш 20 процантаў гадавой патрэбнасці.

***

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР патрабуюць ад мясцовых партыйных, совецкіх, комсамольскіх арганізацый, работнікаў земельных органаў, загатоўчых арганізацый, МТС і соўгасаў правядзення ўборкі ў сціслыя тэрміны і без страт, поўнага забеспячэння выканання ва ўстаноўленыя тэрміны абавязацельстваў па здачы дзяржаве калгасамі і соўгасамі сельскагаспадарчых прадуктаў.

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР звяртаюць увагу партыйных, совецкіх арганізацый, калгаснікаў, работнікаў МТС і соўгасаў на тое, што своечасовае правядзенне ўборачных работ у бягучым годзе, забеспячэнне своечасовага выканання дзяржаўных планаў па загатоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў з'яўляецца важнейшай гаспадарча-палітычнай задачай, паспяховае выкананне якой забяспечыць поўнае захаванне высокага ўраджаю бягучага года і атрыманне ў краіне дастатковай колькасці прадуктаў сельскай гаспадаркі, далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў і яшчэ большы рост заможнасці калгаснікаў.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) І. СТАЛІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР В. МОЛАТАЎ.

У Соўнаркоме СССР Цэнтральным Камітэце ВКП(б)

Аб правядзенні ў жыццё пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб павышэнні ролі майстра на вытворчасці

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і ЦК ВКП(б) устанавілі, што пастанова «Аб павышэнні ролі майстра на заводах цяжкога машынабудаўніцтва» выконваецца нездавальняюча і пры правядзенні яе ў жыццё Народным Камісарам цяжкога машынабудаўніцтва тав. Ефрэмаву дадзены наступныя буйныя памылкі.

1). Замест устаноўленага пастановаю Соўнаркома Саюза ССР і ЦК ВКП(б) парадку атэстацыі майстроў, нованазначаных на пасаду майстра і не маючых тэхнічнай асветы, Наркамцяжмаш арганізаваў агульную пераатэстацыю ўсіх майстроў-практыкаў, ужо працуючых на вытворчасці, пры гэтым у рэзультаце няправільнай арганізацыі гэтай пераатэстацыі дапусціў адстаўленне ад работы значнай колькасці майстроў;

2). У пагоні за вялікай колькасцю майстроў, маючых інжынерна-тэхнічную асвету, кіруючыся чыста фармальнымі прызнакамі, Наркамцяжмаш даў зусім няправільнае ўказанне заводам у кампанейскім парадку замяняць майстроў-практыкаў інжынерамі і тэхнікамі;

3). Замест таго, каб забяспечыць неабходныя ўмовы па павышэнню ролі майстра на вытворчасці, Наркамцяжмаш сканцэнтраваў увагу работнікаў наркамата і дырэктароў заводаў на правядзенні раду тахіх арганізацыйных мер (узбуйненне цэхаў, рэарганізацыя ўпраўлення цэхаў), якія не маюць адносін да рашэння Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб павышэнні ролі майстра на вытворчасці.

У рэзультаце гэтыя няправільныя дзеянні Наркамцяжмаша па правядзенню рашэння Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб майстру на прадпрыемствах цяжкога машынабудаўніцтва ўнеслі няўпэўненасць у асяроддзе майстроў і затармазілі выкананне задачы павышэння ролі і аўтарытэта майстра.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) пастанавілі:

1. Скасаваць, як няправільныя, загады Народнага Камісара цяжкога машынабудаўніцтва т. Ефрэмава № 252 ад 7 чэрвеня 1940 г. і № 290 ад 23 чэрвеня 1940 г.

2. Абавязаць Народнага Камісара цяжкога машынабудаўніцтва т. Ефрэмава распрацаваць новы загад аб мерах па правядзенню ў жыццё рашэння Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб павышэнні ролі майстра на заводах цяжкога машынабудаўніцтва і прадставіць загад на зацвярджэнне Соўнаркома Саюза ССР.

У чэсць VII Сесіі Вярхоўнага Совета СССР

ГОМЕЛЬ, 1 жніўня. (Кар. «Звязды»). Перадавыя прадпрыемствы Гомеля сустракаюць дзень адкрыцця VII Сесіі Вярхоўнага Совета СССР новымі вытворчымі поспехамі. Прадпрыемствы лёгкай прамысловасці датэрмінова выканалі ліпеньскую вытворчую праграму. Абутковая фабрыка «Праца» выканала месячны вытворчы план на 104,5 проц. Звыш плана выпушчана 4500 пар абутку. Датэрмінова выканала ліпеньскую праграму і шчапінная фабрыка. Мылавараны завод тлушчакамбіната выпусціў звыш плана 266 тон мыла. Маргарынавы завод выканаў ліпеньскую праграму на 103,4 проц.

Беларуская чыгунка, якая спаборнічае з Заходняй і Маскоўска-Кіеўскай чыгункамі, патрузіла звыш плана 11.382 вагоны, разгружан звыш плана 11.581 вагон.

БЕЛАСТОК, (кар. «Звязды»). Скліканне Сёмай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР выклікала жывейшую цікавасць сярод сялян Беластоцкай вобласці. Па Заблудаўскаму, Гродненскаму і іншых раёнах штодзённа праходзяць сходы сялян, прысвечаныя прадстаячай Сесіі.

Сяляне-калгаснікі прымаюць рашэнне ў чэсць Сэсіі завяршыць уборку азімых, датэрмінова здаць хлеб дзяржаве.

На сходзе сялянскага актыва Агародніканскага сельсовета, Заблудаўскага раёна, з гарачай прамовай выступіў Фёдар Лукашчук — былы батрак, надзелены Советамі зямлёю.

— Мы земляробы социялістычнай краіны, мы больш не панскія рабы, а грамадзяне магутнай радзімы. Я заклікаю ў чэсць Сесіі датэрмінова выканаць сваё абавязацельства перад дзяржавай.

Актыў прыняў зварот да ўсіх сялян, у якім заклікае ў бліжэйшыя дні завяршыць здачу хлеба дзяржаве.

VII Сесія Вярхоўнага Совета СССР першага склікання

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ аб пасяджэнні Совета Саюза 1 жніўня 1940 года

1 жніўня, у 2 гадзіны дня, у Зале Пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося адкрыццё VII Сесіі Совета Саюза.

Сесію адкрывае Старшыня Совета Саюза дэпутат Андрэеў А. А.

Таварыш Андрэеў А. А. паведамляе, што ў перыяд між VI і VII Сесіямі былі праведзены выбары дэпутата ў Совет Саюза ад Вііпурскай (Выбаргскай) выбарчай акругі Карэла-Фінскай ССР і прадастаўляе слова для даклада Мандатнай Камісіі Совета Саюза депутату Шчэрбакову А. С.

Тав. Шчэрбакоў аглашае пастанову Мандатнай Камісіі Совета Саюза аб выніках праверкі поўнамоцтваў дэпутата Совета Саюза, выбранага ад Вііпурскай (Выбаргскай) выбарчай акругі Карэла-Фінскай ССР.

Совет Саюза па прапанове дэпутата Ігнацьева С. Д. прымае наступную пастанову па дакладу Мандатнай Камісіі:

«Зацвердзіць даклад Мандатнай Камісіі аб прызнанні правільнымі поўнамоцтваў дэпутата Совета Саюза, выбранага 16 чэрвеня 1940 года па Вііпурскай (Выбаргскай) выбарчай акрузе № 613».

Услед за тым Совет Саюза пераходзіць да ўстанаўлення парадку дня Сесіі.

Таварыш Андрэеў аглашае пералік пытанняў, унесеных на разгляд VII Сесіі Совета Саюза.

Дэпутат Куэнецоў І. А. прапануе ўключыць унесеныя на разгляд Совета Саюза пытанні ў парадак дня VII Сесіі Совета Саюза.

Совет Саюза аднагалосна зацвярджае наступны парадак дня:

1. Даклад аб знешняй палітыцы ўрада.
2. Аб утварэнні Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і аб уключэнні паўночнай часткі Букавіны і Хоцінскага, Акерманскага і Ізмаільскага паветаў Бесарабіі ў састаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.
3. Заяву Поўнамоцнай Камісіі сейма Літоўскай рэспублікі.
4. Заяву Поўнамоцнай Камісіі сейма Латвійскай рэспублікі.
5. Заяву Поўнамоцнай Камісіі Дзяржаўнай думы Эстонскай рэспублікі.
6. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятыя паміж Сесіямі і належачыя зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР.

Па прапанове дэпутата Курбанава М. Совет Саюза прымае пастанову—пытанні парадку дня заслухаць і абмеркаваць на сумесных пасяджэннях Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На гэтым першае пасяджэнне VII Сесіі Совета Саюза закрываецца.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ аб пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей 1 жніўня 1940 года

1 жніўня, у 4 гадзіны дня, у Зале Пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося адкрыццё VII Сесіі Совета Нацыянальнасцей.

Сесію адкрывае Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат Швернік Н. М.

Таварыш Швернік Н. М. паведамляе, што на Сесію прыбылі дэпутаты Совета Нацыянальнасцей, выбраныя ад Карэла-Фінскай ССР, і прадастаўляе слова для даклада Мандатнай Камісіі Совета Нацыянальнасцей дэпутату Бурмістэнка М. А.

Тав. Бурмістэнка аглашае пастанову Мандатнай Камісіі Совета Нацыянальнасцей аб рэзультатах праверкі поўнамоцтваў дэпутатаў Совета Нацыянальнасцей, выбраных ад Карэла-Фінскай ССР.

Совет Нацыянальнасцей па прапанове дэпутата Вагова А. В. прымае наступную пастанову па дакладу Мандатнай Камісіі:

«Зацвердзіць даклад Мандатнай Камісіі аб прызнанні правільнымі поўнамоцтваў дэпутатаў Совета Нацыянальнасцей, выбраных па ўсіх 25 выбарчых акругах Карэла-Фінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі па выбарах у Вярхоўны Совет СССР».

Ад імя Совета Нацыянальнасцей тав. Швернік, пад бурныя апладысменты і авацыі, вітае дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР, выбраннікаў народа Карэла-Фінскай ССР.

Следам за тым Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да ўстанаўлення парадку дня Сесіі.

Таварыш Швернік аглашае пералік пытанняў, унесеных на разгляд VII Сесіі Совета Нацыянальнасцей.

Дэпутат Харысаў З. Х. прапануе ўключыць унесеныя на разгляд Совета Нацыянальнасцей пытанні ў парадак дня VII Сесіі Совета Нацыянальнасцей.

Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджае наступны парадак дня:

1. Даклад аб знешняй палітыцы ўрада.
2. Аб утварэнні Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і аб уключэнні паўночнай часткі Букавіны і Хоцінскага, Акерманскага і Ізмаільскага паветаў Бесарабіі ў састаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.
3. Заяву Поўнамоцнай Камісіі сейма Літоўскай рэспублікі.
4. Заяву Поўнамоцнай Камісіі сейма Латвійскай рэспублікі.
5. Заяву Поўнамоцнай Камісіі Дзяржаўнай думы Эстонскай рэспублікі.
6. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятыя паміж Сесіямі і належачыя зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР.

Па прапанове дэпутата Менбарыева А. Х., Совет Нацыянальнасцей прымае пастанову—пытанні парадку дня заслухаць і абмеркаваць на сумесных пасяджэннях Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На гэтым першае пасяджэнне VII Сесіі Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

Дзённік пасяджэння Совета Саюза 1 жніўня 1940 г.

Задоўга да пачатку пасяджэння збіраюцца дэпутаты і госці — стаханаўцы маскоўскіх заводаў і фабрык, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, прадстаўнікі інтэлігенцыі сталіцы.

Скора 2 гадзіны. Зал Пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР перапоўнен. Няма ні аднаго свабоднага месца на балконе і ў ложах совецкай і замежнай прэсы. Прысутнічаюць чыны дыпламатычнага корпуса.

За сталом старшыні — Старшыня Совета Саюза дэпутат А. А. Андрэеў, намеснікі Старшыні Совета Саюза дэпутаты Т. Д. Лысенка і Усман Юсупаў, у ложах — таварышы В. М. Молатаў, Л. М. Каганові ч, А. А. Жданаў, Н. С. Хрушчоў, Н. М. Швернік, Г. М. Маленкоў, М. Ф. Шкіратаў, А. Е. Бадаеў, Н. А. Вазнясенскі, А. Я. Вышынскі, В. А. Малышэў, А. Н. Касыгін, С. М. Будзённы, А. Ф. Горкін, Н. Г. Кузнецоў, І. Т. Тэвасян, А. І. Шахурын, В. В. Вахрушэў, І. А. Бенедыктаў, А. Г. Зверэў і іншыя члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і народныя камісары. Дэпутаты сустракаюць іх доўга не змаўкаючай авацыяй.

Тав. А. А. Андрэеў аб'яўляе VII Сесію Совета Саюза адкрытай. Ён паведамляе, што ў перыяд паміж VI і VII Сесіямі Вярхоўнага Совета СССР адбыліся выбары ў Вярхоўны Совет СССР ад Карэла-Фінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, і прапануе заслухаць даклад Мандатнай Камісіі Совета Саюза аб праверцы поўнамоцтваў дэпутата, выбранага ў Совет Саюза ад Карэла-Фінскай ССР.

Слова прадастаўляецца старшыні Мандатнай Камісіі Совета Саюза дэпутату А. С. Шчэрбакову. Тав. Шчэрбакоў гаворыць, што на падставе закона аб пераўтварэнні Карэльскай АССР у Саюзную Карэла-Фінскую рэспубліку. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР былі назначаны на 16 чэрвеня выбары ў Вярхоўны Совет СССР ад Карэла-Фінскай Саюзнай Рэспублікі. Выбары ў Совет Саюза праводзіліся толькі на новай тэрыторыі, далучанай да Карэла-Фінскай ССР пры пераўтварэнні Карэльскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ў Саюзную Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку. Была ўтворана адна — Вііпурская (Выбаргская) — выбарчая акруга. На астатняй тэрыторыі рэспублікі выбары ў Совет Саюза былі праведзены 12 снежня 1937 года.

Мандатная Камісія, на падставе артыкула 50 Канстытуцыі СССР праверыла прадстаўленыя выбарчай камісіяй дакументы і матэрыялы і ўстанавіла, што выбары па Вііпурскай (Выбаргскай) выбарчай акрузе праведзены на аснове і ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР і Палажэннем аб выбарах. Па Вііпурскай выбарчай акрузе прыняло ўдзел у галасаванні 99,7 проц. выбаршчыкаў, за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 98,15 проц. усіх выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у галасаванні. Дэпутатам Совета Саюза выбран тав. Купрыянаў Генадзій Нікалаевіч — сакратар Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі (большэвікоў) Карэла-Фінскай ССР.

Мандатная Камісія, праверыўшы поўнамоцтвы дэпутата Купрыянава Г. Н. і ўсе прадстаўленыя дакументы і матэрыялы, прызнала іх правільнымі. На зацвярджэнне Сесіі Мандатная Камісія ўносіць рашэнне, у якім канстатуе, што выбары па Вііпурскай (Выбаргскай) выбарчай акрузе № 613 праведзены на аснове і ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР і Палажэннем аб выбарах. Падстаў для касіравання выбараў і скарг аб нарушэннях Канстытуцыі СССР і Палажэння аб выбарах — няма.

Дэпутат С. Д. Ігнацьеў уносіць прапанову: па дакладу Мандатнай Камісіі спрэчак не адкрываць і зацвердзіць даклад Мандатнай Камісіі аб прызнанні правільнымі поўнамоцтваў дэпутата Г. Н. Купрыянава, выбранага па Вііпурскай (Выбаргскай) выбарчай акрузе № 613.

Гэта прапанова прымаецца Советам Саюза аднагалосна.

Старшынствуючы тав. А. А. Андрэеў паведамляе, што на разгляд VII Сесіі Совета Саюза ўносяцца наступныя пытанні:

1. Даклад аб знешняй палітыцы ўрада.
2. Аб утварэнні Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і аб уключэнні паўночнай часткі Букавіны і Хоцінскага, Акерманскага і Ізмаільскага паветаў Бесарабіі ў састаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.
3. Заява Поўнамоцнай Камісіі сейма Літоўскай рэспублікі.
4. Заява Поўнамоцнай Камісіі сейма Латвійскай рэспублікі.
5. Заява Поўнамоцнай Камісіі Дзяржаўнай думы Эстонскай рэспублікі.
6. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятыя паміж Сесіямі і належачыя зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР.

Па прапанове дэпутата І. А. Кузнецова Совет Саюза аднагалосна зацвярджае гэты парадак дня. Аднагалосна прымаецца таксама прапанова дэпутата Мамадалі Курбанава аб тым, каб абмеркаваць пытанні, уключаныя ў парадак дня, на сумесных пасяджэннях Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На гэтым першае пасяджэнне Совета Саюза закрываецца. (ТАСС).

Дзённік пасяджэння Совета Нацыянальнасцей 1 жніўня 1940 г.

Задоўга да адкрыцця Сесіі Совета Нацыянальнасцей у Вялікім Крэмлёўскім палацы пачалі збірацца дэпутаты і госці. 4 гадзіны дня. На месцах гасцей — многа стаханаўцаў і ўдарнікаў фабрык і заводаў сталіцы, байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, прадстаўнікі інтэлігенцыі.

За сталом старшыні — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат Н. М. Швернік, намеснікі Старшыні Совета Нацыянальнасцей дэпутаты Ч. А. Асланава і М. В. Кулагін, у ложах — таварышы В. М. Молатаў, М. І. Калінін, А. І. Мікаян, М. Ф. Шкіратаў, Н. А. Булганін, С. К. Тімашэнка, А. Ф. Горкін, З. А. Шашкоў, Н. М. Рычкоў, М. Б. Касумаў, Р. К. Ібрагімаў, Г. Дзінмухаметаў і іншыя члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і народныя камісары. Дэпутаты і госці вітаюць іх бурнымі апладысментамі.

Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат Н. М. Швернік аб'яўляе VII Сесію Совета Нацыянальнасцей адкрытай. Ён паведамляе, што на Сесію прыбылі дэпутаты, выбраныя ў Совет Нацыянальнасцей ад Карэла-Фінскай ССР. Мандатная Камісія Совета Нацыянальнасцей праверыла мандаты новавыбраных дэпутатаў ад Карэла-Фінскай ССР. Старшынствуючы прадастаўляе слова дакладчыку Мандатнай Камісіі дэпутату М. А. Бурмістэнка.

Дакладчык напамінае, што VI Сесія Вярхоўнага Совета СССР, ідучы насустрач пажаданням працоўных Карэльскай АССР і кіруючыся прынцыпам свабоднага развіцця нацыянальнасцей, прыняла закон аб пераўтварэнні Карэльскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ў Саюзную Карэла-Фінскую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

— Пераўтварэнне Карэльскай АССР у Саюзную Карэла-Фінскую ССР, — гаворыць дэпутат Бурмістэнка, — мае вялікае гістарычнае значэнне, сведчыць аб новых велізарных перамогах ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, забяспечваючай роўнасць нацыянальнасцей, мірнае сужыццё і брацкае садружаства ўсіх народаў.

Працоўныя масы Карэла-Фінскай ССР, як і ўся наша радзіма, сустрэлі гэта рашэнне VI Сесіі Вярхоўнага Совета СССР з велізарным натхненнем і падзякай нашай комуністычнай партыі і вялікаму правадыру народаў усяго свету таварышу Сталіну.

Гэтыя словы выклікаюць у зале бурную авацыю ў чэсць таварыша Сталіна.

Дакладчык адзначае далей, што пераўтварэнне Карэльскай АССР у Саюзную Карэла-Фінскую ССР адкрыла перад працоўнымі рэспублікі шырокую дарогу для далейшага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва на новай, больш высокай ступені нацыянальнага дзяржаўнага існавання ў якасці роўнапраўнай Саюзнай Рэспублікі.

16 чэрвеня 1940 года рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя Карэла-Фінскай ССР на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні выбралі дэпутатаў у Совет Нацыянальнасцей. У Карэла-Фінскай ССР было створана 25 выбарчых округ па выбарах у Совет Нацыянальнасцей. Мандатная Камісія Совета Нацыянальнасцей праверыла выбарчыя дакументы і матэрыялы на кожнага дэпутата, прадстаўленыя акруговымі выбарчымі камісіямі усіх 25 выбарчых округ. Мандатная Камісія ўстанавіла, што выбары дэпутатаў у Совет Нацыянальнасцей па ўсіх 25 выбарчых округах праведзены на аснове і ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР і Палажэннем аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

Дакладчык прыводзіць лічбы, характарызуючыя састаў выбраных дэпутатаў Совета Нацыянальнасцей ад Карэла-Фінскай ССР. Сярод іх — 12 рабочых, 4 селяніна і 9 прадстаўнікоў інтэлігенцыі. У ліку выбраных дэпутатаў 8 карэлаў, 9 фінаў, 7 рускіх і 1 вепс. Нацыянальны састаў дэпутатаў увасабляе сталінскае садружаства народаў Карэла-Фінскай ССР. Па ўсіх 25 выбарчых округах па выбарах у Совет Нацыянальнасцей за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 98,53 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у галасаванні.

У заключэнне дакладчык аглашае пастанову Мандатнай Камісіі Совета Нацыянальнасцей, якая прызнае правільнымі поўнамоцтвы ўсіх дэпутатаў Совета Нацыянальнасцей, выбраных ад Карэла-Фінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Па прапанове дэпутата А. В. Вагова Совет Нацыянальнасцей аднагалосна пастанаўляе зацвердзіць даклад Мандатнай Камісіі аб прызнанні правільнымі поўнамоцтвы дэпутатаў Совета Нацыянальнасцей, выбраных па ўсіх 25 выбарчых округах ад Карэла-Фінскай ССР.

Дэпутаты і госці ўстаюць і наладжваюць гарачую авацыю новым дэпутатам Совета Нацыянальнасцей, выбраннікам карэла-фінскага народа.

Дэпутат Швернік паведамляе, што на разгляд VII Сесіі Совета Нацыянальнасцей уносяцца наступныя пытанні:

1. Даклад аб знешняй палітыцы ўрада.
2. Аб утварэнні Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і аб уключэнні паўночнай часткі Букавіны і Хоцінскага, Акерманскага і Ізмаільскага паветаў Бесарабіі ў састаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.
3. Заява Поўнамоцнай Камісіі сейма Літоўскай рэспублікі.
4. Заява Поўнамоцнай Камісіі сейма Латвійскай рэспублікі.
5. Заява Поўнамоцнай Камісіі Дзяржаўнай думы Эстонскай рэспублікі.
6. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятыя паміж Сесіямі і належачыя зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР.

Па прапанове дэпутата З. Х. Харысава аднагалосна прымаецца рашэнне ўключыць абвешчаныя Старшынёй Совета Нацыянальнасцей пытанні ў парадак дня VII Сесіі Совета Нацыянальнасцей.

Па прапанове дэпутата А. Х. Менбарыева аднагалосна прымаецца рашэнне абмеркаваць гэтыя пытанні на сумесных пасяджэннях Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На гэтым першае пасяджэнне Сесіі Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

(ТАСС).

Сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей

МАСКВА, 1 жніўня. (ТАСС). Сёння вечарам адбылося сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей. За сталом старшыні — Старшыня Совета Саюза дэпутат Андрэеў, яго намеснікі дэпутаты Лысенка і Усман Юсупаў і Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат Швернік і яго намеснікі дэпутаты Асланава і Кулагін, у ложах — таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Каганові ч, Калінін, Жданаў, Мікаян, Хрушчоў, Берыя, Маленкоў, Шкіратаў, Тімашэнка, члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, народныя камісары СССР.

Дэпутаты і госці наладжваюць таварышу Сталіну і яго саратнікам поўную захапленя авацыю, якая прадаўжаецца некалькі мінут.

Старшынствуючы Старшыня Совета Саюза дэпутат Андрэеў паведаміў, што ў Маскву прыбылі і ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР прысутнічаюць поўнамоцныя камісіі сейма Літоўскай рэспублікі, сейма Латвійскай рэспублікі і Дзяржаўнай думы Эстонскай рэспублікі і дэлегацыя ад працоўных Бесарабіі і паўночнай часткі Букавіны. Дэпутаты Вярхоўнага Совета горача віталі членаў поўнамоцных камісій і дэлегацыю, а ў іх асобе брацкія народы Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны.

Затым Сесія перайшла да разгляду першага пункта парадку дня. Слова для даклада аб знешняй палітыцы ўрада прадастаўляецца Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнаму Камісару Замежных Спраў СССР Вячэславу Міхайлавічу Молатаву. Прысутныя падымаюцца з месц і бурна рукаплешчуць главе Совецкага ўрада, бліжэйшаму саратніку вялікага Сталіна. Нясуцца воклічы: «Ура—таварышу Сталіну!», «Ура — таварышу Молатаву!».

Даклад таварыша Молатава выслухоўваецца з вялікай увагаю і суправаджаецца шумнымі адабральнымі апладысментамі. Выражаючы волю ўсяго совецкага народа, дэпутаты вітаюць мудрую сталінскую знешнюю палітыку Совецкага ўрада.

Па сканчэнні даклада таварыша Молатава з прамовай выступае дэпутат А. С. Шчэрбакоў. Дэпутат Шчэрбакоў уносіць прапанову, у выніку вычэрпваючай ясненасці і паслядоўнасці знешняй палітыкі ўрада СССР,—спрэчак па дакладу таварыша Молатава не адкрываць. Гэта прапанова прымаецца аднагалосна. Па прапанове тав. Шчэрбакова Сесія таксама аднагалосна прымае наступнае рашэнне:

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, заслухаўшы даклад Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша Молатава В. М. аб знешняй палітыцы ўрада, пастанаўляе: адобрыць знешнюю палітыку ўрада.

Прыняцце гэтага рашэння суправаджаецца працяглай авацыяй.

На гэтым першае сумеснае пасяджэнне абодвух палат Вярхоўнага Совета СССР заканчваецца. Наступнае пасяджэнне назначана на 6 гадзін вечара 2 жніўня.

АБ ПАСЯДЖЭННІ VII СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

2 жніўня, у 6 гадзін вечара, у Зале Пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбудзецца сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

ТЭЛЕГРАМЫ

ВОДГУКІ НА ЎСТАНАЎЛЕННЕ СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ПРЫБАЛТЫЦЫ

ЛОНДАН, 1 жніўня. (ТАСС). Газета «Дэйлі уоркер» атрымлівае многа пісем ад рабочых, у якіх яны вітаюць устанаўленне совецкай улады ў балтыйскіх дзяржавах і іх зварот да СССР з просьбай аб прыняцці ў састаў Совецкага Саюза. Група лейбарыстаў Усходняга Лондана піша: «Самыя надзвычайныя навіны, якія мы даведаліся ў апошнія тыдні, — гэта весткі аб стварэнні народных урадаў у балтыйскіх дзяржавах».

Група рабочых тэстыльшчыкаў піша з Ланкашыра: «Перадайце, калі ласка, народам Літвы, Латвіі і Эстоніі наша віншаванне. У гэтыя дні маскоўскае радыё паведаміла нас аб знамянальных падзеях — аб вызваленні гэтых краін ад ярма капіталізма».

СУТЫЧКІ ПАМІЖ РАБОЧЫМІ І ПАЛІЦЭЙСКІМІ Ў ХЕЛЬСІНКІ

ХЕЛЬСІНКІ, 1 жніўня. (ТАСС). Учора ў 7 гадзін ўвечары павінен быў адбыцца сход членаў таварыства дружбы і міру з СССР у рабочым раёне. У палове сёмага каля будынка, дзе павінен быў адбыцца сход, сабралося звыш 2 тысяч чалавек. За 15 мінут да пачатка сходу на дзверах паявілася аб'ява, што гаспадар дому катэгарычна адмаўляецца прадаставіць памяшканне. Праз некалькі мінут прыбылі мясцовыя паліцэйскія. Па сігналу старшага паліцэйскага пачалося збіванне рабочых і служачых, якія прышлі на сход. Прахожыя, сабраўшыяся каля будынку, падтрымалі рабочых і служачых — членаў таварыства. Рабочыя аказалі рашучае супраціўленне, закідваючы паліцэйскіх каменнямі. Многа жанчын, старыкоў і мужчын збіта паліцэйскімі.

Пасля таго як стала вядома, што сход не адбудзецца, былі раскіданы лістоўкі наступнага зместу: «Самаўладдзе не можа забараніць нам выражаць нашу думку аб будучым. Далоў Танера! Няхай жыве совецка-фінляндская дружба! Вызвальце Рюэмя!».

Сутычка з паліцыяй адбылася ў Тампери і іншых гарадах. Збіванні членаў таварыства і паліцэйскія пагромы прадаўжаюцца на працягу трох месяцаў.

Падрыхтоўка германскага наступлення на Англію

НЬЮ-ЙОРК, 1 жніўня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс, вялікая колькасць італьянскіх эскадрыльяў самалётаў і парашутных часцей знаходзіцца зараз на ўзбярэжжы Паўночнай Францыі, Бельгіі і Галандыі, рыхтуючыся дапамагчы Германіі пры нападзе на Англію.

Перадаюць, што Іспанія рыхтуецца напасці на Гібралтар. Іспанскія войскі і ўзброеныя кацеры з артылерыяй канцэнтруюцца ў Ла-Лінеа.

Італьянцы канцэнтруюць у Сардыніі бамбардыроўшчыкі для нападу на Гібралтар. Італія перавяла ў Германію падводныя лодкі. Германскія войскі, якія знаходзіліся на лініі Мажыно, перакінуты на захад. У Паўночнай Францыі, Бельгіі і Галандыі пераабсталяваны спартыўныя і іншыя пляцоўкі пад аэрадромы.

Зводка германскага камандавання

БЕРЛІН, 1 жніўня. (ТАСС). У зводцы германскага камандавання германскай арміі гаворыцца: «31 ліпеня на захад ад астравоў Сіллі падвергнуты бамбардыроўцы некалькі гандлёвых параходаў праціўніка. Зроблены налёты на параходы, партовыя збудаванні ў Паўднёвай Англіі і на непрыяцельскія маякі. Заўважаны выбухі і пажары. Вечарам на шырацэ Дуўра адбыліся паветраныя баі. Без страт удалося збіць 5 англійскіх знішчальнікаў і 2 аэрастаты. Над тэрыторыяй Нарвегіі, Даніі і Галандыі збіты тры непрыяцельскія самалёты. Страты непрыяцеля склалі ўчора восем самалётаў. Германская авіяцыя страціла два самалёты.

Італьянская зводка ваенных дзеянняў

РЫМ, 1 жніўня. (ТАСС). У зводцы італьянскага камандавання гаворыцца: 28 ліпеня італьянскімі самалётамі ва ўсходняй частцы Міжземнага мора затоплен эсмінец праціўніка.

Над востравам Мальтай нашы знішчальнікі збілі два самалёты праціўніка, адзін італьяскі самалёт не вярнуўся на базу.

Ва Усходняй Афрыцы італьянская авіяцыя з поспехам бамбардыравала аўтамабільны парк у Важыры. На аэрадроме ў Буна (Кенія) пашкоджаны тры самалёты.

Праціўнік зрабіў налёт на Каосала, нанёсшы некаторую шкоду.

Марскі бой у Атлантычным акіяне

ЛОНДАН, 1 жніўня. (ТАСС). Англійскае марское міністэрства паведамляе пра бой у паўднёвай частцы Атлантычнага акіяна паміж англійскім дапаможным крэйсерам «Алькантара» водазмяшчэннем у 19.846 тон і германскім караблём. Германскі карабль атрымаў пашкоджанні, але ўнікнуў капчатковай гібелі, укрыўшыся дымавой заслонай. Пашкоджанні, нанесеныя крэйсеру «Алькантара», не далі яму магчымасці развіць скорасць, патрэбную на тое, каб дагнаць непрыяцеля. Страты на «Алькантара» — двое забітых і сямёра раненых. Пошукі германскага карабля прадаўжаюцца.

Абвяржэнне Анаталійскага агенцтва

Па просьбе турэцкага пасольства ў Маскве апублікоўваем наступнае абвяржэнне Анаталійскага агенцтва:

«Анаталійскае агенцтва ўпоўнаважана аб'явіць пазбаўленай усякай падставы навіну, перададзную з Стамбула адным замежным карэспандэнтам і пашыраную некаторымі агенцтвамі і радыё, — навіну, паводле якой Турцыя робіць, нібыта, пасылку войск ва ўсходнія вілаяеты».

Вобыск у памяшканні компартыі ў Брайтоне

ЛОНДАН, 1 жніўня. (ТАСС). Сышчыкі зрабілі вобыск у памяшканні Брайтонскага камітэта англійскай компартыі і забралі комуністычныя брашуры і некаторую маёмасць камітэта.

БРАК НА ХЛЕБАЗАВОДЗЕ

На адным паверсе хлебазавода ідзе закваска і загатоўка цеста, на другім — поўфабрыкат ператвараецца ў гатовую прадукцыю. Тут пры выпечцы выяўляюцца ўсе недахопы тэхналагічнага працэса.

Вось выкацілі рухомы под з печы сістэмы «ХВ». На ім румяныя, гатовыя, але расплюснутыя лялёшкай калачы. Высунулі другі, — такая-ж прадукцыя. Завод выпусціў яўны брак. Усім ясна адно: складуць акт, выпечка пойдзе ў перапрацоўку, прынясе страты заводу, дзяржаве, хлеб своечасова не паступіць у магазіны.

На гэты раз брак прыняў асабліва вялікія размеры. У адзін дзень з адной толькі выпечкі было пасавана 603 кілограмы хлеба. У чым прычына? Дзе віноўнікі браку? Аказваецца брыгада тав. Майсейчыка замясіла цеста на халоднай вадзе. Лабарант Сюркіна дапусціла парушэнне правіл загатоўкі цеста. Слесар Парфоменка нядбайна аднёсся да сваіх абавязкаў і не прасачыў за тым, каб у чане была цёплая вада.

Такія непрыемнасці здараюцца не ўпершыню. Кожны дзень па той або іншай прычыне мінскі хлебазавод выпускае бракаваную прадукцыю, якая ідзе ў перапрацоўку. Праўда, даныя аб браку фіксіруюцца ў кнігах, прадукцыя яго даследуецца ў лабараторыі, але карысці ад гэтага мала.

За першае паўгоддзе завод меў ад перапрацоўкі браку на 14.027 руб. страт. Характэрна, што калі ў першым квартале было выпушчана 68 тон бракаванай прадукцыі, то ў другім квартале колькасць ле не зменшылася, а, наадварот, павялічылася на 3 з лішнім тоны. У ліпені за першую дэкаду брак складаў 1,15 проц. Адна толькі 4-я брыгада Батаева за 20 дзён ліпеня дала 6.325 кг браку. Гэтыя факты гавораць аб тым, што майстры і брыгадзіры ўсё яшчэ безадказна адносяцца да сваіх абавязкаў, не сочаць за выкананнем стандарта, рэцэптуры, за добраякаснай работай кожнага рабочага.

...Люк звініць, заглушаючы шум у цэху. Позіркі ўсіх рабочых звернуты на работніцу Вайда. Яна стукае нажом у люк і дае знак — «прастайваю, цеста няма». Праходзіць 10—15 мінут, ніхто не адказвае. Як відаць, наверсе загаварыліся і своечасова не перакулілі дзяжу з цестам. Вайда бярэ цяжкую гіру і моцна б'е на люку. А цеста па-ранейшаму не паступае. Кожны прастой рабочых цеста-мясільнага цэха выклікае прастой работніц ля цестадзяліцеляў. Дырэкцыя-ж на ўсё гэта тлядзіць скрозь пальцы.

На мінскім механізіраваным хлебазаводзе ёсць усе магчымасці выпускаць добраякасную прадукцыю. Трэба толькі сур'ёзна ўзяцца за справу, павесці рашучую барацьбу з бракам.

Р. СІМХОВІЧ.

Рэспубліканскія спаборніцтвы па баскетболу

Чатыры дні на мінскім стадыёне «Дынама» імені Кірава праходзілі рэспубліканскія спаборніцтвы па баскетболу. У іх прыняло ўдзел сем мужчынскіх і тры жаночых каманды гарадоў Мінска, Беластока, Брэста, Гродна, Пінска, Магілева і Вілейкі.

Першае месца сярод мужчынскіх каманд заняла каманда г. Мінска, другое месца — каманда г. Гродна і трэцяе месца — каманда г. Беластока. Сярод жаночых каманд першае месца заваявалі баскетбалісткі г. Мінска.



У піонерскіх лагерах. У гэтым годзе 500 дзяцей чыгуначнікаў Брэст-Літоўскай чыгункі ў дачных жывапісных месцах, весела і культурна праводзяць свой летні адпачынак. На здымку: раніцняя прагулка лагернікаў. Фото Я. Салавейчыка.

КУЛЬТПАХО ЖАНЧЫН-АКТЫВІСТА

Жанчыны - ак вісткі, жонкі кам дзіраў і стахан цаў - крываносаў мінскага аддзяле Заходняй чыгу правялі культпа па ўчасках Мінс Негарэлае, Мінск Радашковічы і Ма — Смалявічы, п свечаны Дню чы начніка. У пахо прыняла ўдзел чалавек.

Жанчыны - ак вісткі ў час пах правялі рад гутар сярод рабочых-пуц цаў, пуцявых абх чыкаў і іх сямей Дні чыгуначніка.

НАПЯРЭДАДНІ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ФІЗКУЛЬТУРНАГА ПАРАДА

4 жніўня ў Мінску адбудзецца ўсебеларускі фізкультурны парад. 16 тысяч моцных і смелых юнакоў і дзяўчат прадэманстрыруюць сваю гатоўнасць да працы і абароны. Пасля парада на плошчы імені Леніна, на стадыёне «Дынама» імені Кірава адбудзецца вялікае фізкультурнае свята. Тут на зялёным полі перад гледачамі выступяць дэлегацыі фізкультурнікаў усіх абласцей БССР.

Фізкультурнікі сталіцы рэспублікі паўторяць свае выступленні, якія яны паказалі на Краснай плошчы ў Маскве.

Кожная абласць падрыхтавала цікавую і змястоўную інсцэніроўку. Упершыню свае поспехі пакажуць фізкультурнікі заходніх абласцей БССР.

«17 верасня 1939 г.» — такая тэма выступлення баранавіцкіх фізкультурнікаў.

...На полі стаяць пагранічныя слупы. Відносецца надпіс «Прывітанне працоўным Захада» — надпіс, які напамінае нам знамянальную арку на станцыі Коласава. Ціха на граніцы. Раптам з-за лесу паяўляецца совецкі танк. Насустрач яму накіроўваюцца працоўныя Заходняй Беларусі, сімвалізіруючы радасную сустрэчу насельніцтвам часцей Чырвонай Арміі. Радасць вызваленага народа выліваецца ў народную пляску. Затым фізкультурнікі паказваюць розныя пластычныя рухі.

120 фізкультурнікаў Беластоцкай вобласці сваім выступленнем раскажуць аб тым, як тэкстыльны Беласток ператвараецца ў другое Іванава. У цэнтры паяўляецца ткацкі станок, з якога выходзіць вялікае палотнішча; на ім напісаны словы прывітання лепшаму другу фізкультурнікаў таварышу Сталіну.

Гомельскія фізкультурнікі падрыхтавалі інсцэніроўку на тэму «Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівую маладосць».

На абаронную тэму — «За радзіму, за Сталіна» — выступяць віцебскія фізкультурнікі. Брэсцкія фізкультурнікі пакажуць інсцэніроўку «З'єднаная Беларусь».

Таксама цікавымі і змястоўнымі будуць выступленні дэлегацый Мінскай, Магілеўскай, Мазырскай, Вілейскай і Пінскай абласцей рэспублікі.

Учора на стадыёне «Дынама» імені Кірава ішлі рэпетыцыі да ўсебеларускага парада фізкультурнікаў.

НОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

На будаўніцтва і рэканструкцыі прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці БССР у гэтым годзе асігнавана звыш мільёнаў рублёў. Вялікае будаўніцтва разгорнута ў заходніх абласцях нашай рэспублікі.

У Гродне заканчваецца будаўніцтво абутковай фабрыкі. Зараз вядуцца мантажныя работы. Фабрыка будзе выраблять 567 тысяч пар абутку ў год.

У асноўным закончана будаўніцтво Нарэўскага шклозавода. Прадпрыемства ўступіць у эксплаатацыю праз некалькі месяцаў. На заводзе будзе выраблять гаспадарчая пасуда.

Адначасова ідзе рэканструкцыя скурзавода № 5 у Гродне, скурзавода № 7 у Скідэлі і рада іншых прадпрыемстваў.

Выкананне плана торфзавода

НАРКАМАТА МЯСЦОВАЙ ПАЛІЎНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР за 31 ліпеня 1940 г. (у процантах)

Заводы	Сутачнае задание	Календарнае
Асінторф	52,7	94,0
«Чырвоны сцяг»	83,2	84,6
Ім. Орджанікідзе	8,5	86,5
Ім. Даумана	112,1	120,8
Дукора	79 7	105,7
Радзічава	71,0	49,7
Міханавічы	107,5	128,6
Балбасава	90,3	86,6
Змяёўка	92.0	96,4
Свабода	74 5	79,6
Лукская	92,0	93,9
Татарка	89,0	89,4
Давыдаўка	117,0	96,4
Дубінец	70,0	69,7
Крэмянец	98,4	81,2
«КІМ»	50,3	62,1
Новая Беларусь	128,6	89,9
Хвойны Масток	128 0	121,8
Туголіца	124,0	35,1
УСЯГО	64,7	90,7

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ

Геалагічная экспедыцыя ў заходнія абласці

Геолага-разведчая экспедыцыя Інстытута геалогіі Акадэміі навук БССР закончыла работы па абследванню карысных выкапняў у Брэсцкай вобласці.

Геолагамі абследвана да 40 месц. Значныя скапленні глін выяўлены ў Брэсцкім раёне. Вялікія запасы высокаякаснага мелу ёсць у Бярозаўскім раёне. Гэты мел можа ўжывацца ў папяровай, гумавай і шкляной прамысловасці. Знойдзены запасы мелу ў Маларыцкім і Семеціцкім раёнах. У Ружанскім раёне на глыбіні 12 метраў залягае торфа-магніт, які можа быць скарыстан у якасці паліва.

У плане работ экспедыцыі—абследванне месцараджэнняў каштоўных выкапняў у Пінскай вобласці.

Да ўсесаюзнага агляду драматычных самадзейных калектываў

БРЭСТ. (Кар. «Звязды»). У верасні-кастрычніку бягучага года праводзіцца ўсесаюзны агляд драматычных самадзейных калектываў. Дзейную падрыхтоўку да агляду разгарнулі абласны аддзел мастацтваў і Дом народнай творчасці Брэсцкай вобласці. 6 драматычных калектываў вобласці ўжо ўключыліся ў падрыхтоўку да агляду. Так, драматычны калектыў Гайнаўскага раёна, які складаецца з 28 чалавек, рыхтуе п'есу Остроўскага «Лес», драматычны калектыў Кляшчэльскага раёна—«Славу» Гусева. П'есу Шолам-Алейхема «200 тысяч» на яўрэйскай мове ў дні агляду пакажа драматычны калектыў Брэсцкага клуба работнікаў дзяржгандлю.

У парадку падрыхтоўкі да агляду Дом народнай творчасці праводзіць трохмесячныя курсы (на 30 чалавек) па падрыхтоўцы кіраўнікоў самадзейных калектываў.

ДЗЯРЖЦЫРК
(парк імені Горкага тэл. 22-725)
СЁННЯ НОВАЯ ПРАГРАМА:
1-я гастроль совецкага атракцыёна «АЭРАПЛАН У ПАВЕТРЫ»
3—БАРОНЕНКА—3
1-я гастроль рэкардсмена-эквілібрыста Міхаіла ЕГОРАВА. УДЗЕЛЬНІЧАЕ ЎСЯ ТРУПА.
ПРАДАЎЖЭННЕ МАТЧАЎ ФРАНЦУЗСКАЙ БАРАЦЬБЫ.
БОРУЦЦА 3 пары
1. Сустрэча 2 дужэйшых барцоў ДЗЯКОЎСКІ — БУРЭВОЙ.
2. Другая 40-мінутная сустрэча ВАЛЕНЦІНАЎ — КАРА-РУСТАМ.
3. СТРЫЖАК — САФРОНАЎ.
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Пачатак барацьбы ў 11 гадзін вечара.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» ВЯЛІКІ ВАЛЬС
Кінотэатр «Родина» МАЁ КАХАННЕ
Кінотэатр «Інтэрнацыянал» ЧЭСЦЬ
Кінотэатр «Спартак» ЧАПЯРТЫ ПЕРЫСКОП
Дзіцячы кінотэатр
1. ДЗЕНЬ У АРТЭКУ.
2. Журналы «ПІОНЕРЫЯ» №№ 8 і 16.
3. МЕДЗВЯЖОНАК (мультыплікацыя)
4. МОЙ-ДАДЫР.
Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
1. САЮЗКІНО-ЖУРНАЛ № 66.
2. ЖУРНАЛЫ «СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» №№ 38—40.
3. МЕДЗВЯЖОНАК (мультыплікацыя).

Рэчыцкае педагагічнае вучылішча
аб'яўляе НАБОР навучаючыхся
НА 1940/41 ВУЧЭБНЫ ГОД.
У педвучылішча прымаюцца асобы, якія маюць адукацыю ў аб'ёме няпоўнай сярэдняй школы або 7 класаў сярэдняй школы, ва ўзросце ад 15 да 35 год.
Паступаючыя ў 1-шы клас падвяргаюцца іспытам у аб'ёме праграмы НСШ па наступных прадметах: па беларускай і рускай мовах (вусна і пісьмова), арыфметыцы і алгебры (вусна і пісьмова), геаметрыі (вусна), Канстытуцыі СССР і геаграфіі.
Асобы, якія скончылі НСШ або 7 класаў СШ на «выдатна», прымаюцца без іспытаў.
Скончыўшыя 8 класаў СШ трымаюць іспыты на агульных падставах.
Жадаючыя паступіць ў 2-гі або 3-ці клас падвяргаюцца іспытам за папярэдні клас па ўсіх прадметах.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 15 ЖНІЎНЯ.
Да заявы прыкласці наступныя дакументы: пасведчанне аб адукацыі (арыгінал), кароткую аўтабіяграфію, пасведчанне аб нараджэнні, даведку аб стане здароўя, тры завераныя фотакарткі з уласнаручным подпісам паступаючага, 1 марак на 60 кап.
Прыёмныя іспыты з 16 па 25 жніўня.
На іспыты з'яўляцца толькі па выкліку дырэкцыі.
Навучаючыяся забяспечваюцца стыпендыяй у залежнасці ад паспяховасці і інтэрнатам.
ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ З 1 ВЕРАСНЯ.
ЗАЯВЫ З ДАКУМЕНТАМІ ПАСЫЛАЦЬ НА ІМЯ ДЫРЭКТАРА ПА АДРАСУ: БССР, гор. Рэчыца, Гомельскай вобласці, Вакзальная, 92, педвучылішча.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Мар'іна-Горскі сельскагаспадарчы тэхнікум
аб'яўляе
ПРЫЁМ на першы КУРС
1940/41 ВУЧЭБНАГА ГОДА
Тэхнікум рыхтуе АГРАНОМАЎ-ПАЛЯВОДАЎ і АГРАНОМАЎ-САДАВОДАЎ СЯРЭДНЯЙ КВАЛІФІКАЦЫІ. Тэрмін навучання чатыры гады.
Прымаюцца асобы ад 15 да 30 год, з адукацыяй не ніжэй НСШ (сямігодкі).
Іспыты ў аб'ёме НСШ па матэматыцы, рускай і беларускай мовах і літаратуры, фізіцы, фізічнай геаграфіі і Канстытуцыі СССР.
Увага: скончыўшыя НСШ у 1940 г. і маючыя па вышэй указаных прадметах адзнакі «ВЫДАТНА» прымаюцца без іспытаў.
Прыём заяў да 20 жніўня. Іспыты з 19 па 28 жніўня. Пачатак заняткаў 1 верасня. Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам.
ЗАЯВЫ ПАДАВАЦЬ ПА АДРАСУ: БССР, паштовае аддзяленне Мар'іна-Горка, дырэкцыі сельскагаспадарчага тэхнікума.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ДЗЯРЖСТРАХ СССР
Звыш дванаццаці мільёнаў працоўных СССР застрахавана ў Дзяржстраху па дабраволнаму калектыўнаму страхаванню жыцця
ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ЗАСТРАХАВАНАМУ
Арганізуйце калектыўнае страхаванне жыцця!
СТРАХАВАННЕ ПРЫМАЕЦЦА НА СУМУ 5.000, 4.000, 3.000, 2.000, 1.000 і 500 руб.
СТРАХАВАННЕ ПРАВОДЗІЦЦА ПА МЕЙСЦУ РАБОТЫ ПРАЦОЎНЫХ
ПРОЛЕТАРЫІ ЎСЯГО СВЕТУ, ЯДНАЙЦЕСЯ!
НКФ БССР
ДЗЯРЖСТРАХ КАЛЕКТЫЎНАЕ СТРАХАВАННЕ ЖЫЦЦЯ
Плата 12 руб. у год за кожную тысячу рублёў страхавой сумы.
Узносы па калектыўнаму страхаванню жыцця ўплачваюцца зборшчыку камсода ўперад за кожны квартал.
За даведкамі звяртайцеся ў камсоды і інспекцыі Дзяржстраха пры райгорфінадделах і да страхавых агентаў у сельскіх мясцовастях БССР.
Упраўленне Дзяржстраха НКФ БССР.

Беларускі Дзяржаўны універсітэт
АБ'ЯЎЛЯЕ
ПРЫЁМ у АСПІРАНТУРУ
па наступных спецыяльнасцях:
ГІСТОРЫЯ ВКП(б), ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ, МАТЭМАТЫКА, ФІЗІКА, ЗААЛОГІЯ (фізіялогія жывёл), БАТАНІКА (фізіялогія раслін), ФІЗІЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ, ЭКАНОМГЕАГРАФІЯ
і ў ЗАВОЧНУЮ ПА:
ПАЛІТЭКАНОМІІ, ГІСТОРЫІ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ, ЗААЛОГІІ (фізіялогія жывёл), БАТАНІЦЫ (фізіялогія раслін).
ПРЫЁМ ДАКУМЕНТАЎ ПА 15 ЖНІЎНЯ.
ІСПЫТЫ З 20 ЖНІЎНЯ ПА 1 ВЕРАСНЯ.
Прымаюцца ў аспірантуру асобы, маючыя закончаную вышэйшую асвету, і праявіўшыя здольнасць да навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці. Усе паступаючыя ў аспірантуру падвяргаюцца прыёмным іспытам па курсу: «Асновы марксізма-ленінізма», па спецыяльнай дысцыпліне і па адной з замежных моў.
Іспыты праводзяцца ў аб'ёме дзеючых праграм вышэйшых навучальных устаноў (універсітэта).
Тэрмін навучання 3 годы, уключаючы абарону дысертацыі.
Залічаныя ў аспірантуру (апрача завочнікаў) атрымліваюць стыпендыю ў размеры 400 руб. у месяц і 400 руб. у год на набыццё навуковай літаратуры.
Пры паступленні павінны быць прадстаўлены наступныя дакументы: аўтабіяграфія, дыплом аб сканчэнні ВНУ, даведка аб стане здароўя, характарыстыка з апошняга месца работы або вучобы, дакументы аб адносінах да воінскай павіннасці, даведка аб вытворчым стажы і дзве фотакарткі.
Прадастаўляецца інтэрнат. Члены сямі інтэрнатам не забяспечваюцца.
ДАКУМЕНТЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСУ: гор. Мінск, Універсітэцкі гарадок, біялагічны корпус, вучэбнай часткі БДУ.
ДЫРЭКЦЫЯ.

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТРЭСТ ВІНАРОБЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ
паведамляе
ЗАЦІКАЎЛЕНЫМ УСТАНОВАМ І ПРАДПРЫЕМСТВАМ,
што ЗАВОДЫ трэста
ПРЫМАЮЦЬ ДАВАЛЬЧАСКУЮ СЫРАВІНУ — ПЛАДЫ І ЯГАДЫ — ДЛЯ ПЕРААПРАЦОЎКІ Ў ПРАДУКЦЫЮ
ПА ДАГАВОРАНАСЦІ З ПАСТАЎШЧЫКОМ СЫРАВІНЫ.
ЗАКАЗЫ на пераапрацоўку сыравіны прымаюць наступныя ПЛОДАВІНЗАВОДЫ:
ВІЦЕБСКІ, ГОМЕЛЬСКІ, ПОЛАЦКІ, СЛУЦКІ, РЭЧЫЦКІ, ЧАЧЭРСКІ
РЭЧЫЦКІ (Рэчыцкі, Свяцілавіцкага раёна), ЧАШНІЦКІ (в. Гілі, Чашніцкага раёна),
ТАЛАЧЫНСКІ (в. Азярцы, Талачынскага раёна), КОПЫЛЬСКІ.
ГРОДНЕНСКІ, ЖАБЧЫЦКІ (Жабчыцы, Пінскай вобласці).
АДРАС ТРЭСТА: МІНСК, ВУЛ. ПУШКІНА, ДОМ ДРУКУ.
Тэл. 21-507.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Советская 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 20.000 (камутатар) дадатковы 102, намесніка адказнага рэдактара — 25.188, адказнага сакратара — 21.353, сакратарыята — 22.412, прыёмная рэдактара — 21.352, літаратурнага сакратарыята—21.846, аддзелаў: партыйнага — 21.356, совецка-гандлёвага — 21.885, прамыслова-транспартнага — 20.830, сельскагаспадарчага — 25.180, культуры і школ — 23.955, унутранай інфармацыі — 21.399, рабселькораў і пісем працоўных — 20.844, 21.845, агульны рэдакцыі — 21.556, загадчыка выдавецтва — 21.358, выпускаючага — 24.768, карэктарскай — 21.357, бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 21.360.

Уп. Галоўлітбала № Р—1855. Мінск, друкарня «Звязды», Совэцкая, 49. К., Ж., Ш.